КАНДЫТАР АБ ПРАФЕСІІ І ЗАРОБКАХ

Сямейная газета

ЯК ЗРАБІЦЬ АДНОСІНЫ МОЦНЫМІ

Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 ЖНІЎНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 166 (29280)

ЦЫТАТА ДНЯ

Лілія КІР'ЯК, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў:

«Школы не павінны быць пляцоўкай для палітычных спрэчак, дыскусій, абмеркаванняў, а настаўнікі — сродкам палітычнай барацьбы. Вельмі спадзяюся на цвярозы розум бацькоў. Яны не павінны ўцягваць дзяцей у палітычную сітуацыю і настройваць іх супраць настаўнікаў. Толькі ў канструктыўным узаемадзеянні школы і сям'і, у цесным супрацоўніцтве можна забяспечыць кожнаму вучню адукацыю з улікам яго здольнасцяў».

КАРАТКА

- **Больш за 1 мільён школьнікаў прыступяць да заняткаў 1 верасня.**

- «Гомсельмаш» паставіў 100 збожжаўборачных камбайнаў сельгасарганізацыям Віцебскай вобласці.
- **«Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Рыгу да 6 верасня.**
- Уезд ва Украіну для замежнікаў закрыюць да 28 верасня.
- **Генадзь Савілаў падаў у адстаўку з пасады старшыні ФХРБ.**
- На кліентаў Беларусбанка пачасціліся фішынгавыя атакі. Ашуканцы выклікаюць абанентаў з нумароў, якія пачынаюцца на +370, +371, +372, +376.

ISSN 1990 - 763X

20166

Юбілей!

ДА СТА ГАДОЎ БЕЗ СТАРАСЦІ

Пазітыўныя адносіны да жыцця і людзей — крыніца даўгалецця

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Сёння ў Героя Сацыялістычнай Працы, чырвонаармейца, камандзіра партызанскага атрада, партыйнага і гаспадарчага дзеяча Беларусі Аляксандра СЛАБАДЫ юбілей, яму споўнілася сто гадоў. Аляксандр Іванавіч у 1963—1967 гадах быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, у 1990—1994-м — дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Ён — удзельнік Парада Перамогі ў Маскве ў 1995, 2000, 2005 гадах.

СТАР. 13

Сацыяльны ракурс

ЛЕТНЯЕ АЗДАРАЎЛЕННЕ

з папраўкай на каранавірус

Летняя аздараўленчая кампанія праходзіла сёлета ва ўмовах напружанай эпідэміялагічнай сітуацыі. Тым не менш яна адбылася. Усе пытанні па захаванні распрацаваных метадычных рэкамендацый па прадухіленні распаўсюджвання каранавіруса былі вырашаныя яшчэ цягам першай лагернай змены. І беларускі досвед па масавым аздараўленні дзяцей ва ўмовах COVID-19 можа стаць прыкладам для іншых краін, якія ад яго арганізацыі вырашылі адмовіцца. Такую думку выказаў намеснік начальніка аддзела дзяржаўных закупак і метадычнай работы Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Аляксей ЖЭЛЯНКОЎ.

СТАР. 4

На слыху

ВАЛЮТА ЁСЦЬ І БУДЗЕ. БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

Нацыянальны банк не плануе ўводзіць валютныя абмежаванні, каб стрымаць рост курсаў замежнай валюты. Пра гэта днямі заявіў член праўлення Нацбанка Дзмітрый МУРЫН.

Ён жа растлумачыў, чаму так актыўна растуць курсы валют у нашай краіне. На думку Дзмітрыя Мурына, «фундаментальных фактараў для такой дынамікі курса, якую мы назіраем, няма. Адзіная прычына — негатыўныя чаканні».

Па словах члена праўлення Нацбанка, попыт на валюту пачаў расці ў канцы ліпеня, а апошнім часам «былі дні, калі попыт узрастаў супраць звычайнага амаль у тры разы». У сувязі з гэтым Нацыянальны банк краіны не плануе ўводзіць якія-небудзь валютныя абмежаванні. Акрамя таго, у Нацбанку лічаць, што ўвядзенне абмежаванняў прынясе супрацьлеглы эфект.

Дзмітрый Мурын лічыць, што на цяперашні момант праблема з дэфіцытам наяўнай валюты ў некаторых банках носіць тэхнічны характар і звязана з фізічнай адсутнасцю купюр па прычыне вялікага попыту. Праблем з валютнай ліквіднасцю ў банкаў няма.

Таксама Нацбанк не збіраецца вяртаць абавязковы продаж валютнай выручкі, уводзіць мэтавы продаж валюты, абмяжоўваць уклады або валютныя рахункі. Пры гэтым па неабходнасці рэгулятар гатовы рэфінансаваць банкі не толькі ў беларускіх рублях, але і ў замежнай валюце.

СТАР. 4

Ігар ПЕТРЫШЭНКА:

«Зрабіць малыя гарады камфортнымі для жыцця і звярнуцца да вытокаў роднай мовы і культуры»

У Бялынічах падвялі вынікі падрыхтоўкі да Дня беларускага пісьменства

Учора тут адбылося выніковае пасяджэнне Нацыянальнага аргкамітэта па падрыхтоўцы да свята пад кіраўніцтвам яго старшыні, намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Ігара ПЕТРЫШЭНКІ.

Удзел у абмеркаванні надзённых клопатаў прынялі намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка, міністр інфармацыі Ігар Луцкі, першы намеснік міністра культуры Наталля Карчэўская, намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі, прадстаўнікі абласной і раённай

Фота БелТА.

улады, адказныя за правядзенне свята. Былі абмеркаваныя праграма мерапрыемства, цырымонія адкрыцця і закрыцця свята, фармат удзелу афіцыйных гасцей.

Госці і гаспадары Бялыніч наведалі знакавыя аб'екты свята, ацанілі іх стан. За час падрыхтоўкі цэнтральная частка Бялыніч стала непазнавальнай. На вуліцы Савецкай памянялі тратуарную плітку і вулічнае асвятленне, стварылі веладарожкі, абнавілі праезджую частку. Капітальна адрамантаваныя жылыя дамы і будынкі сацыяльнай сферы, пабудаваны новы раённы мастацкі музей, абноўлены гарадскі парк «Ліпавы гай».

— Сапраўды, зроблена вялікая работа па падрыхтоўцы горада да свята, — падвёў вынік сустрэчы Ігар Петрышэнка. — Музей, кінатэатр, Дом культуры сталі шматфункцыянальнымі і сучаснымі. Вельмі правільна, што ў кінатэатры з'явілася бібліятэка. Трэба, каб чалавек з дзяцінства выхоўваў у сабе цікавасць да кнігі. Уразіў музей, які абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. Ён павінен стаць своеасаблівым адукацыйным цэнтрам для школьнікаў.

Традыцыйна Дзень беларускага пісьменства праходзіць у гарадах, якія з'яўляюцца гістарычнымі цэнтрамі культуры, навукі, літаратуры і кнігадрукавання. Бялынічам ёсць чым ганарыцца. Тут нарадзіўся славуты мастак Вітольд Бялыніцкі-Біруля, на працягу стагоддзяў горад быў значным рэлігійным цэнтрам. Бялыніччына — радзіма выдатных мастакоў сучаснасці Віктара Альшэўскага, Ларысы Журавовіч, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, перакладчыка паэмы «Слова аб паходзе Ігаравым» Ігара Шклярэўскага, паэта і перакладчыка Вячаслава Казакевіча, іншых знакамітасцяў. Існуе цудоўнае паданне пра тое, што гэтае месца асвечана прысутнасцю Божай Маці, якая з'явілася тут у вобразе іконы Бялыніцкай Божай маці. Спецыяльна да свята падрыхтавана кампазіцыя новай скульптуры «З'яўленне іконы». На жаль, не захаваўся грандыёзны кармяліцкі манастыр, які быў заснаваны ў Бялынічах у сярэдзіне 17 стагоддзя — яго ўзарвалі ў савецкі час. Але майстры зрабілі рэканструкцыю старадаўняй фрэскі манастыра. Яна стане цэнтральным экспанатам абноўленага музея.

Святкаванне Дня беларускага пісьменства будзе напоўнена асаблівымі зместам. Запланавана вялікая колькасць мерапрыемстваў для моладзі, навукова-практычных і літаратурных сустрэч, канцэртаў. Удзельнікі і госці змогуць азнаёміцца з кніжнымі навінкамі, сустрэцца з літаратарамі, журналістамі, выдаўцамі, паслухаць выступленні паэтаў і пісьменнікаў, творчых калектываў і выканаўцаў. Акрамя гэтага, на Дні беларускага пісьменства традыцыйна праходзіць узнагароджанне пераможцаў конкурсу на найлепшыя літаратурныя творы года. Пройдзе круглы стол беларускіх і замежных пісьменнікаў.

— Кожны раз мы выбіраем для гэтага свята горад, які выразна дэманструе спецыфіку рэгіёна, — кажа Ігар Петрышэнка. — У Магілёўскай вобласці яно праводзіцца ўжо чацвёрты раз. Задача дзяржавы — стварыць у маленькіх гарадах такія ж умовы, што і ў вялікім горадзе. На прыкладзе Бялыніч мы бачым, што так яно і ёсць. Такія мерапрыемствы добра рашаюць гэтыя пытанні. Другі важны момант — гэта папулярызацыя беларускай кнігі і стварэнне ўмоў для творчай дзейнасці беларускіх аўтараў. Галоўнае — генераваць ідэі і пісаць надзённыя творы.

Дарэчы, у 2021 годзе Дзень беларускага пісьменства пройдзе ў Капылі Мінскай вобласці. Нагадаем: на Капыльшчыне нарадзіліся класікі беларускай літаратуры Кузьма Чорны, Алесь Адамовіч.

Нэлі ЗІГУЛЯ,

Бялыніцкі раён.

Справы духоўныя

Родам з Брэстчыны, з 26 гадоў — манах

25 жніўня 2020 года ў Данілавым манастыры горада Масквы пад старшынствам Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла на чарговым пасяджэнні Свяшчэннага Сінода Рускай Праваслаўнай Царквы было задаволена прашэнне Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла аб вызваленні ад пасады Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Члены Сінода выказалі Праасвяшчэннаму Паўлу падзяку за працу на чале Беларускай праваслаўнай царквы і прынялі рашэнне прызначыць яго мітрапалітам Екацерынбургскім і Кубанскім, кіраўніком Кубанскай мітраполіі. Пра гэта паведамляе афіцыйны сайт Маскоўскага патрыярхату.

Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Сінод прызначыў епіскапа Барысаўскага і Мар'інагорскага Веніяміна. За ім захавана часовае кіраванне Барысаўскай епархіяй.

На афіцыйным сайце Беларускай праваслаўнай царквы размешчаныя наступныя старонкі біяграфіі ўладыкі Веніяміна. Свецкае імя епіскапа Барысаўскага — Віталь Іванавіч Тупека. Ён нарадзіўся 16 верасня 1968 года ў Лунінцы Брэсцкай вобласці, дзе скончыў сярэднюю школу № 1. Пасля гэтага будучы епіскап паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на факультэт радыёфізікі і электронікі, падчас вучобы ў якім адслужыў у арміі. У чэрвені 1992 года атрымаў дыплом па спецыяльнасці «інжынер-радыёфізік».

У жніўні таго ж года паступіў у Мінскую духоўную семінарыю. Пасля заканчэння трэцяга курса падаў прашэнне і быў прыняты ў лік браціі Свята-Успенскага Жыровіцкага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра.

16 снежня 1994 года ў Свята-Успенскім саборы намеснікам манастыра архімандрытам Гурыем (цяпер архіепіскап Навагрудскі і Слонімскі) па дабраславенні мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі (цяпер Ганаровы патрыяршы экзарх усяе Беларусі), пастрыжаны ў манаства з імем Веніямін у гонар свяшчэннамучаніка Веніяміна, мітрапаліта Петраградскага і Гдоўскага.

9 студзеня 1995 года мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам за Бажэственнай літургіяй у Свята-Успенскім саборы Жыровіцкага манастыра хіратанісаны ў іерадыякана, а 13 лютага — у іераманаха. 20 чэрвеня 1996 года прызначаны на пасаду скарбніка манастыра.

Пасля заканчэння Мінскай духоўнай семінарыі паступіў на першы курс Мінскай духоўнай акадэміі, якую скончыў у 1999 годзе з вучонай ступенню «кандыдат багаслоўя». 14 снежня таго ж года ўзведзены ў сан ігумена.

З 2005 да ліпеня 2009 года — благачынны Жыровіцкага манастыра. 20 мая 2006 года ўзведзены ў сан архімандрыта. 1 ліпеня 2009 года прызначаны на пасаду намесніка Свята-Дабравешчанскага Лядзенскага мужчынскага манастыра Мінскай епархіі.

У складзе дэлегацыі Мінскай епархіі браў удзел у Памесным Саборы Рускай Праваслаўнай Царквы ў студзені 2009 года.

21 сакавіка 2010 года Патрыярх Кірыл узначаліў у Храме Хрыста Збавіцеля хіратонію архімандрыта Веніяміна (Тупека) у епіскапа Барысаўскага, вікарыя Мінскай епархіі.

«Менавіта Крыж бачу перад сабою я ў самым цэнтры епіскапскага служэння: Крыж, на якім мне трэба будзе крыжаваць сваю волю і свае страсці, самалюбства і ганарыстасць, ганарлівасць і самаўпэўненасць, — казаў архімандрыт Веніямін (Тупека) падчас нарачэння ў епіскапа Барысаўскага, вікарыя Мінскай епархіі. — Звяртаючы свой позірк да мінулага, я пераасэнсоўваю ўсё сваё жыццё: дзяцінства і малалецтва ў сям'і, вучобу ў свецкіх школах і вайсковую службу, выхаванне ў школах духоўных і послухі ў Свята-Успенскім Жыровіцкім і Свята-Дабравешчанскім Лядзенскім манастырах. Гэтыя этапы майго жыцця былі як прыступкі, па якіх вяла мяне Воля Божая, калі рыхтавала да гэтага служэння».

З 2010 да 2015 года ўладыка Веніямін узначальваў Выдавецкі савет Беларускай Праваслаўнай Царквы, з 2014 года — Сінадальны аддзел рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі, тады ж быў прызначаны намеснікам старшыні Царкоўнага суда Беларускага Экзархата. У тым жа годзе атрымаў епіскапскі тытул «праасвяшчэнны Барысаўскі і Мар'інагорскі».

Мітрапаліт — кавалер двух ордэнаў Беларускай праваслаўнай царквы: свяціцеля Кірылы Тураўскага і Крыжа прападобнай Ефрасінні Полацкай. У год свайго 50-годдзя па рашэнні Патрыярха Кірыла быў узнагароджаны ордэнам прападобнага Серафіма Сароўскага III ступені.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кітай і ЗША гатовыя вярнуцца да абмеркавання гандлёвай здзелкі

Гандлёвыя прадстаўнікі ЗША і Кітая пацвердзілі сваю прыхільнасць да заключэння першай фазы гандлёвага пагаднення, хоць кітайскі бок не выконваў свае абавязацельствы па куплі амерыканскіх тавараў у поўным аб'ёме, перадае Reuters. Адпаведная заява была зроблена пасля тэлефоннай размовы паміж гандлёвым прадстаўніком ЗША Робертам Лайтхізерам, міністрам фінансаў ЗША Стывенам Мнучынам і віцэ-прэм'ерам Кітая Лю Хэ. Гэта стала іх першымі афіцыйнымі перагаворамі з пачатку мая. «Абодва бакі бачаць прагрэс і поўныя рашучасці зрабіць крокі, неабходныя для забеспячэння поспеху (гандлёвага) пагаднення», — адзначаецца ў заяве гандлёвага прадстаўніка ЗША (USTR) пасля званка.

Сусветная туріндустрыя страціла трэць трыльёна долараў

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш расказаў аб стратах, якія прычыніў COVID-19 глабальнай турыстычнай галіне, трэцяму па значнасці экспартнаму сектару сусветнай эканомікі пасля вытворчасці паліва і хімічных рэчываў, які летась складаў 7 працэнтаў ад глабальнага гандлю. Толькі за студзень—май 2020 года турсектар страціў амаль трэць трыльёна долараў. Да таго ж пад пагрозай апынулася больш за 120 мільёнаў рабочых месцаў. «У турсектары працуе кожны дзясяты жыхар Зямлі», — падкрэсліў Антоніу Гутэрыш.

Сандра Карвай, якая ўзначальвае аддзел па вывучэнні і канкурэнтаздольнасці турысцкага рынку ў Сусветнай турысцкай арганізацыі ААН (UNWTO), паведаміла, што экспартныя страты турсектара ў першыя пяць месяцаў гэтага года перавысілі страты ўсяго 2009 года, на які прыйшоўся пік сусветнага фінансавага крызісу. «Ніводнай краіне не ўдалося зберагчы свой турсектар ад Covid», — падкрэсліла яна. Згодна з прагнозам UNWTO, за ўвесь 2020-ы глабальны турсектар можа страціць ад 0,96 да 1,2 трлн долараў. Гэта прывядзе да зніжэння ВУП усёй планеты на 1,5—2,8 %.

Прэм'ер Фінляндыі прапанавала адмовіцца ад васьмігадзіннага рабочага дня

У Фінляндыі неабходна скараціць стандартны рабочы дзень, які займае восем гадзін, заявіла прэм'ер-міністр краіны Сана Марын, перадае Reuters. Яна мяркуе, што памяншэнне працягласці работы можна кампенсаваць павелічэннем прадукцыйнасці. Ідэю скарачэння рабочага дня да шасці гадзін і пераходу на 4-дзённы рабочы тыдзень Марын высоўвала яшчэ да таго, як стала прэм'ерам, нагадвае агенцтва. У жніўні 2019 года яна заявіла, што людзі заслугоўваюць таго, каб праводзіць больш часу са сваімі сем'ямі і прысвячаць яго сваім хобі і свайму жыццю. Цяпер Марын трэба будзе пераканаць усю кіруючую левацэнтрысцкую кааліцыю з пяці партый у тым, што скарачэнне рабочага часу неабходна ва ўмовах росту беспрацоўя з-за пандэміі, адзначае Reuters. «Нам неабходна стварыць дакладнае бачанне наконт таго, як Фінляндыя можа рушыць наперад да скарачэння рабочага часу, а фінскія служачыя — да лепшага працоўнага жыцця», — падкрэсліла прэм'ер-міністр на сустрэчы са сваімі калегамі па Сацыял-дэмакратычнай партыі.

ГУЧНА І ШЧЫРА!

Акцыі «За мір, стабільнасць і бяспеку» праходзяць на працягу тыдня ў розных гарадах краіны

Чарговы раз больш за тысячу чалавек сабралася вечарам каля Камароўскага рынку ў Мінску. Сярод прысутных — як моладзь, сем'і з дзецьмі, так і людзі старэйшага пакалення. Не перашкодзіў ім выйсці ў падтрымку сваіх поглядаў нават лівень.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Напачатку мерапрыемства выступілі артысты беларускай эстрады, пасля чаго быў абвешчаны свабодны мікрафон, дзе ўсе ахвотныя маглі выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю гучна і шчыра.

Адным з першых выступіў старшыня асацыяцыі ветэранаў МУС «Гонар», палкоўнік у адстаўцы Дзмітрый Паўлічэнка. Экс-камандзір вайсковай часці 3214, экс-камандзір САХРа расказаў:

— У дзевяностыя кожны дзень у горадзе былі забойствы, бандытызм, злачыннасць, разбоі! Мы абаранілі горад. Што ж цяпер? На жаль, моладзь, а менавіта некаторая яе частка, пачала граміць наш горад. Не дадзім прасоўвання экстрэмісцкіх ідэй, экстрэмісцкіх мэт!

— Давайце не будзем дзяліць нашу нацыю на чужых і сваіх. Мы разам, за моцную квітнеючую Беларусь! Разам мы сіла! — данеслася з натоўпу.

Пенсіянеры Валянціна і Валерый Мілонавічы прыехалі з дачы толькі дзеля таго, каб папрысутнічаць на гэтым мітынгу. Кажуць, што вельмі хвалююцца за будучыню краіны.

— Усё, што маем цяпер, было створана пры нас, на нашых вачах. Маладыя людзі, якім па 15—20 гадоў не бачылі краіну 26 гадоў таму. І зараз вельмі балюча бачыць, што нехта хоча ўсё знішчыць, разарваць на часткі. Лічу, што нашу моладзь адурманьваюць, але ўпэўнена, яны адумаюцца. Мы заклікаем да гэтага. Трэба цаніць тое, што маем, не звяртаць увагу на дробязі і недахопы. Мы ж тут нарадзіліся, нашы дзяды, прадзеды, бацькі адстойвалі краіну, ваявалі за яе, і дзеля чаго? Каб зараз так бяздарна яе страціць? Мы не можам гэтага дапусціць! Усёй душой за яднанне нашага народа.

Супрацоўніца Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Наталля Расціславаўна ўпэўнена: ніякія грошы не заменяць міру і спакою.

— Лічу, што зараз сітуацыя сур'ёзная і нам сапраўды трэба разумець, чаго мы чакаем ад сваёй будучыні. Трэба зрабіць правільны выбар. Баюся, што калі яго не зрабіць, палова краіны апынецца ў вельмі дрэнных умовах. Маладыя людзі атрымалі краіну, якую мы, старэйшае пакаленне, усімі сіламі як маглі стараліся зрабіць прыгажэйшай і лепшай. Менавіта я «за» паступальнае эвалюцыйнае развіццё, як кажа наш Прэзідэнт. Вядома, не ўсё ў краіне гладка, але жыць у невядомасці горш за ўсё. Нам трэба быць больш уважлівымі адно да аднаго, не трэба гнацца за доўгім рублём. Страшна, што моладзь гэтаму паддаецца.

Васямнаццацігадовая студэнтка БДЭУ Яна шчыра кажа: «Я люблю сваю краіну, мне падабаецца тое, як я жыву, падабаецца стабільнасць. Не разумею, навошта нейкія перамены і якіх менавіта хочуць перамен. Я супраць гэтага. Таксама непрыемна, калі нехта спецыяльна стварае шум на вуліцах. Трэба ж разумець, што ёсць маленькія дзеці, пажылыя, якім розныя сігналы аўтамабіляў і іншыя заклікі да чагосьці могуць вельмі перашкаджаць».

Мінчанка Людміла цяпер ужо на пенсіі. На мітынг «За Беларусь» прыйшла ўпершыню, аднак кажа, што спыняцца не збіраецца.

— Хочацца, каб мы жылі ў спакоі. Мне вельмі падабаецца тое, як выглядае наша краіна, як тут чыста і прыгожа. Назіраю, што моладзь, якая сёння выступае супраць улады, ездзіць на добрых аўтамабілях, дык чаго ім не хапае? Думаю, моладзь трэба проста заняць чымсьці карысным, каб не было часу думаць пра непатрэбнае.

Пенсіянерка Алена Уладзіміраўна не хавае слёз: «Я вельмі хвалююся за Беларусь! Я тут свабодная, атрымліваю добрую пенсію. Сама з Гомеля, аднак паспела пажыць і ў Расіі, і ў розных гарадах нашай краіны. Магу сказаць: лепш не знайсці, чым наша родная Беларусь. Іншым часам пытаю ў маладых людзей, чаго яны яшчэ хочуць, але дакладнага адказу не атрымліваю. Мне іх шкада, асабліва дзяцей. Шмат сярод іх тых, хто проста заблытаўся».

У завяршэнні мітынгу на будынку рынку з'явілася выява дзяржаўнага сцяга, а прысутныя спелі гімн Беларусі. Аналагічныя акцыі ў падтрымку кіраўніка дзяржавы прайшлі ўчора і ў іншых гарадах краіны. Мітынгі адбыліся ў Бярозе, Дзяржынску, Лідзе, Баранавічах, Маларыце і Івацэвічах.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Рэгіёны

ПРАНІКНЁНА АБ ГАЛОЎНЫМ

Мітынгі ў падтрымку міру, спакою і бяспекі праходзяць у раённых цэнтрах Гродзенскай вобласці

На гэтым тыдні да мірных ініцыятыў далучыліся жыхары Свіслачы, Смаргоні, Ліды і Зэльвы. Людзі дзеляцца сваімі думкамі аб тым, што адбываецца ў Беларусі, выступаюць за стабільную і квітнеючую краіну.

Каля паўтысячы чалавек прыйшлі на цэнтральную плошчу Зэльвы, каб выказаць свае думкі і паслухаць іншых. Сярод удзельнікаў акцыі — аграрыі, медыкі, настаўнікі, ветэраны працы. Зэльвенцы прыйшлі з добрым настроем, у многіх у руках плакаты «У нас усё ОК», «Мы розныя, а Беларусь адна». Старшыня райвыканкама Дзяніс Альшэўскі зазначыў, што ў краіне няпростая сітуацыя, але Беларусь не павінна стаць пляцоўкай для каляровай рэвалюцыі, якая можа разарваць наш народ.

Прысутныя бурна сустрэлі выступленне зэльвенца Івана Мацюка. Мабыць, таму, што ён казаў аб сваім асабістым, аб тым, што «набалела».

— Не ведаю, як у вас, а ў мяне рэальна набалела ад усяго, што адбываецца. Балюча бачыць, як адзіны народ раптам раздзяліўся на два лагеры, надакучыла чытаць застрашальныя стужкі ў інтэрнэце. Нам трэба задумацца аб гэтым і не дапусціць бяды, — заклікаў прамоўца.

У падтрымку міру і бяспекі на гарадскія плошчы выйшлі і ў Смаргоні. На мітынг прыйшлі прадстаўнікі многіх прадпрыемстваў. Удзельнікі мірнай акцыі прайшлі калонай па цэнтры горада. Тут шмат плакатаў «Зберажом Беларусь», «Любімую не аддаюць».

Мітынг «За Беларусь!» таксама прайшоў у Лідзе. Жыхары горада і раёна розных узростаў і прафесій сабраліся на цэнтральнай Дажыначнай плошчы. У акцыі прынялі ўдзел каля 3,5 тысячы чалавек. Прадстаўнікі працоўных калектываў прыйшлі са сцягамі. Уздоўж плошчы выстраілася калона аўтамабіляў большасці лідскіх прадпрыемстваў. Лідчан павітаў старшыня райвыканкама Сяргей Ложачнік, затым перад удзельнікамі акцыі выступілі мясцовыя музычныя калектывы і выканаўцы.

Яскравае шоу падчас акцыі «За любімую Беларусь» назіралі жыхары Свіслачы. Над цэнтральнай плошчай праляцеў авіяпланерыст з дзяржаўным сцягам. Удзельнікі акцыі апладысментамі прывіталі маладую прамоўцу, якая сказала, што выраслa ў краіне, дзе не страшна хадзіць па вуліцах, ёсць магчымасць рэалізоўваць свае планы і ідэі. Таму зараз неабходна захаваць усё лепшае, што маецца, памнажыць і ні ў якім выпадку не страціць.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Добры настрой

Калі адчынены ўсе дзверы

У сталіцы прайшла традыцыйная акцыя для будучых першакласнікаў «Збяром партфель разам», ініцыяваная Мінскай гарадской арганізацыяй Беларускага саюза жанчын і грамадскім аб'яднанням «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў». Больш за 160 дзяцей з сем'яў, якія знаходзяцца ў складанай жыццёвай сітуацыі, атрымалі партфелі і школьныя прылады напярэдадні навучальнага года.

Перад тым як запрасіць усіх у прасторную залу для правядзення святочнага мерапрыемства, для маленькіх гасцей зладзілі гульні і фотасесіі з героямі вядомых мультсерыялаў. Яно і не дзіўна — будучыя школьнікі прыбраныя ў прыгожыя касцюмы і сукенкі. Выступаючы перад прысутнымі, **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага саюза жанчын Жанна РАМАНОВІЧ** адзначыла, што першыя школьныя дні як для дзяцей, так і для іх бацькоў — заўсёды няпросты перыяд: «Першы клас — гэта вельмі адказна. На працягу многіх гадоў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і розныя грамадскія аб'яднанні, асацыяцыя шматдзетных бацькоў і грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», Мінская гарадская арганізацыя Беларускага саюза жанчын робяць усё магчымае, каб першага верасня для кожнага першакласніка стала яркай і запамінальнай падзеяй. Наша задача — стварыць добры настрой для ўсіх».

Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» Таццяна КРАЎЧАНКА звярнула ўвагу, што Дзень ведаў — гэта заўсёды свята для кожнага першакласніка. «Хай ён падорыць вам радасць і поспехі!» — пажадала яна.

Падчас акцыі дзецям прапанавалі святочную праграму з удзелам артыстаў беларускай эстрады. Перад праглядам мультфільма «Фіксікі супраць крабатаў» будучыя школьнікі паабяцалі любіць сваю сям'ю і краіну, быць ветлівымі і культурнымі, добра есці і расці здаровымі, а таксама хораша вучыцца.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

❍ Меркаванне

«Я лічу вызначальнай ролю бацькоў»

Валянціна РАЖАНЕЦ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі растлумачыла, чаму медыяадукаванасць неабходная кожнаму беларусу:

«Інфармацыйныя тэхналогіі з іх імклівым развіццём патрабуюць ад чалавека спецыяльных уменняў не толькі ў карыстанні імі, але і ва ўспрыманні плыні ведаў, якія да іх трапляюць праз інтэрнэт, сацыяльныя сеткі. Гэтыя інструменты могуць быць задзейнічаны не толькі ў пазітыўным ключы — камунікацыі і адукацыі, а і для некарэктных мэт.

Важна, на мой погляд, не трапіць у залежнасць ад сацыяльных сетак і не стаць ахвярай злачынцаў ці паліттэхналагічных маніпулятараў. Таму нам неабходна развіваць медыяадукаванасць, фарміраваць уменне аналізаваць, ацэньваць тое, што мы бачым, чытаем, суадносіць гэта з рэальным жыццём.

У сацыяльных сетках ствараецца ўражанне ананімнасці, усёдазволенасці, але між тым ёсць і рэальная адказнасць за нібыта віртуальныя ўчынкі. Я лічу вызначальнай ролю бацькоў у фарміраванні культуры прысутнасці дзяцей і падлеткаў у інтэрнэт-прасторы, іх бяспецы, абароне ад негатыву і дэструктыўнай інфармацыі».

Перадумоў для дэвальвацыі няма

Так лічаць эксперты

Апошнія падзеі ў Беларусі прывялі да чутак пра магчымую рэзкую дэвальвацыю беларускага рубля. Дэфіцыт валюты ў абменніках гэтыя настроі толькі падагравае. Аднак эканамічных перадумоў паўтарэння ў краіне валютнага крызісу 2011 года сёння няма, і гэтаму ёсць канкрэтныя прычыны, лічыць эксперт беларускага Цэнтра эканамічных даследаванняў BEROC Настасся Лузгіна, перадае Forbes.

Некалькі гадоў таму Нацыянальны банк краіны перайшоў да рэжыму свабоднага курсаўтварэння. Курс беларускага рубля вызначаецца на Беларускай валютна-фондавай біржы па выніках правядзення бесперапыннага падвойнага аўкцыёну. Кожны дзень на біржы банкі заключаюць здзелкі па куплі і продажы замежнай валюты. Сярэднеўзважаны курс па выніках гэтых таргоў з'яўляецца афіцыйным курсам беларускага рубля на наступны дзень. Нацбанк можа выступаць у якасці прадаўца або пакупніка замежнай валюты і такім чынам уплываць на яе кошт. Але такія ўмяшанні выкарыстоўваюцца толькі для згладжвання рэзкіх кароткатэрміновых ваганняў.

Пры гэтым у доўгатэрміновую курсавую дынаміку рэгулятар не ўмешваецца. Гэта можна бачыць на прыкладзе змены курса беларускага рубля да долара ў сакавіку гэтага года. За месяц беларускі рубель патанеў з 2,24 да 2,6 беларускага рубля за долар, што было выклікана ў асноўным рэзкім падзеннем расійскага рубля. Нацыянальны банк выходзіў на біржу ў якасці прадаўца замежнай валюты. Але як толькі курс расійскай валюты стабілізаваўся — беларускі рубель таксама добра сябе адчуў, адзначае Настасся Лузгіна.

Апошнія некалькі тыдняў на валютным рынку Беларусі зноў назіраецца паступовае зніжэнне курса беларускага рубля. Адным з фактараў такой дынамікі з'яўляюцца ўзрослыя інфляцыйныя і дэвальвацыйныя чаканні насельніцтва. Больш дэталёвую карціну работы валютнага рынку можна будзе сфарміраваць на аснове статыстычных звестак за жнівень. Аднак ужо зараз відавочна, што рост попыту на замежную валюту прыводзіць да зніжэння нацыянальнай валюты да замежных і падагравае чуткі аб рэзкай дэвальвацыі. Ёсць і праблема з недахопам валюты ў абменных пунктах, што таксама ўзмацняе дэвальвацыйныя чаканні. Але асноўная частка валютных сродкаў банкаў знаходзіцца ў безнаяўнай форме, і толькі невялікая іх доля захоўваецца ў выглядзе наяўных грошай. Для таго каб задаволіць узрослы попыт на наяўную валюту, фінансавым установам неабходна яе завезці. На гэта патрабуецца час. Таму цяпер мы і назіраем дэфіцыт валюты ў абменніках.

У любым выпадку, зараз эканамічныя перадумовы, якія б маглі справакаваць рэзкую дэвальвацыю, як адбылося, напрыклад, у 2011 годзе, адсутнічаюць. Гэтаму ёсць тры тлумачэнні. У адрозненне ад сітуацыі амаль дзесяцігадовай даўнасці, сёння валютны курс фарміруецца на аснове попыту і прапановы. Такім чынам не накапляецца разрыў паміж ростам цэн і змяненнем кошту нацыянальнай валюты. Інфляцыя захоўваецца блізкай да прагнозных значэнняў. На пачатак жніўня валютныя рэзервы дасягнулі $8,86 млрд, у той час як на 1 жніўня 2011-га іх памер быў меншы за $4,2 млрд.

Другое — адной з перадумоў ціску на валютны рынак у 2011 годзе з'яўлялася паскоранае павелічэнне рэальных даходаў насельніцтва ў 2010 годзе (14,8 % па выніках года, па звестках Белстата, паведамляе Forbes) і рост адмоўнага сальда гандлёвага балансу. Сёлета назіраюцца ўмераны рост даходаў насельніцтва (5,4 % у гадавым выражэнні ў першым паўгоддзі, па звестках Белстата, 6,1 % — па выніках 2019 года) і скарачэнне спажывання ў II квартале ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ў выніку пагаршэння эпідэміялагічнай сітуацыі. Яшчэ адна прычына — змяненне ў апошнія некалькі гадоў структуры дэпазітаў у бок павелічэння бездадзыўных. Як лічыць Настасся Лузгіна, усё гэта робіць малаверагоднай магчымасць хуткай дэвальвацыі беларускага рубля ў бліжэйшы час.

ВАЛЮТА ЁСЦЬ І БУДЗЕ. БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таксама стала вядома, што Нацыянальны банк Беларусі рэкамендуе банкам своечасова падмацоўваць абменныя пункты, касы грашовай наяўнасцю для бесперабойнага правядзення валютна-абменных аперацый. У прыватнасці, спецыялісты Нацбанка падрыхтавалі паведамленне, якое атрымалі ўсе фінансавыя інстытуты. У ім гаворыцца, што «з улікам назіраемага ў апошнія дні павышанага попыту на замежную валюту Нацыянальны банк лічыць неабходным прыняцце з боку банкаўскага сектара ўсебаковых і вычарпальных мер па своечасовым падмацаванні абменных пунктаў, кас грашовай наяўнасцю ў аб'ёмах, неабходных для бесперабойнага правядзення валютна-абменных аперацый на працягу рабочага дня і ажыццяўлення аперацый па продажы наяўнай замежнай валюты насельніцтву ў адпаведнасці з попытам па курсе, які складваецца на ўнутраным валютным рынку».

Нацбанк таксама лічыць мэтазгодным больш актыўна інфармаваць жыхароў нашай краіны пра магчымасць здзяйснення безнаяўных валютна-абменных аперацый, у тым ліку пры дапамозе сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання кліентаў, а таксама з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак, эмітаваных да рахункаў у замежнай валюце. «Пры гэтым банкам варта ўзважана і эканамічна абгрунтавана падыходзіць да ўстанаўлення курсаў пакупкі і продажу замежнай валюты», — адзначае ён. Таксама рэгулятар звярнуў увагу на неабходнасць своечасовага інфармавання кліентаў аб установленых абменных курсах і іх змене. Гэтая інфармацыя павінна размяшчацца на стэндах, электронных табло, афіцыйных сайтах банкаў, з выкарыстаннем бягучага радка на мультымедыйных экранах.

Як вядома, за некалькі дзён да гэтага Нацбанк прыняў рашэнне часова абмежаваць выдачу банкам крэдытаў авернайт. Эксперты звязваюць гэта з узмацненнем жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі, каб банкі канкурыравалі за прыцягненне грошай Нацбанка. Было падкрэслена, што рэгулятар не адмаўляецца ад падтрымкі банкаў ліквіднасцю, але ён будзе задавальняць гэты попыт галоўным чынам на аўкцыённай аснове.

Сяргей КУРКАЧ.

Тэндэнцыя

ЗА КАМУНАЛКУ — СА СМАРТФОНА

Як аказалася, гэта сапраўды прасцей

Здавалася б, інтэрнэтам нашы людзі карыстаюцца ўжо не першы год, а кожны другі ўладальнік сотавага тэлефона з яго дапамогай раніцай бегла праглядае навіны. Але вось актыўна плаціць у электронным варыянце аддалена мы сталі толькі цяпер. Адзін камерцыйны банк склаў рэйтынг падобных аперацый.

Дык вось, як аказалася, за апошнія месяцы мы сталі істотна больш карыстацца мабільным і інтэрнэт-банкінгам. Самыя папулярныя аперацыі — пагашэнне крэдыту, адвольныя плацяжы і папаўненне карткі. У прыватнасці, у красавіку агульная сума аперацый праз інтэрнэт-банкінг павысілася больш чым на 7 % у параўнанні з лютым. Выраслa як колькасць аперацый, так і сярэдні чэк.

Што важна, павялічылася колькасць кліентаў, якія аддаюць перавагу аплаце са смартфона. Так, колькасць карыстальнікаў мабільнага банкінгу за перыяд з 1 лютага да 1 мая выраслa больш чым на 12 %. У банку таксама склалі рэйтынг найбольш папулярных аперацый у мабільным і інтэрнэт-банкінгу. Першыя месцы займаюць пагашэнне крэдыту і адвольныя плацяжы, калі для аплаты тавару ці паслугі трэба паказаць УНП, разліковы рахунак атрымальніка і код яго банка. Многія папаўняюць балансы сваіх картак, вядуць разлікі за мабільную сувязь і інтэрнэт. Папулярным таксама стала аплачваць у анлайне камунальныя плацяжы, электраэнергію і газ.

У банку адзначаюць, што здзяйсняць пераводы, плацяжы і іншыя дзеянні праз інтэрнэт-банкінг звычайна значна больш бяспечна. Усе аперацыі максімальна абароненыя, а ў выпадку страты карткі можна адразу заблакаваць рахунак. Спецыялісты рэкамендуюць карыстацца аўтааплатай: выбраць плацеж, паказаць суму і перыядычнасць разлікаў. Патрэбная сума спішацца ў інтэрнэт-банкінгу аўтаматычна.

Апошнім часам назіраецца павышаная цікавасць да выкарыстання мабільнага і інтэрнэт-банкінгу. Нават тыя, хто ні разу гэтага не рабіў, пачынаюць здзяйсняць плацяжы са смартфона або камп'ютара. Хтосьці асвоіў гэты спосаб самастойна, камусьці дапамаглі дзеці. У той жа час банкіры разумеюць, што калі чалавек рэгулярна здзяйсняў плацяжы ў касе аддзялення, то хутка перабудавацца на новы фармат нялёгка. Таму шматлікія банкі стварылі відэаінструкцыі па самых папулярных плацяжах у інтэрнэт-банкінгу, якія дапамогуць адаптавацца немаладым кліентам у новых умовах. Шукайце іх у інтэрнэце — і наперад.

Сяргей КУРКАЧ.

ЛЕТНЯЕ АЗДАРАЎЛЕННЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

За тры змены больш за 150 тысяч навучэнцаў аздаравілася ў 3630 лагерах. На 24 жніўня ў краіне яшчэ працуе 338 лагераў, дзе знаходзіцца 17 тысяч дзяцей. Усяго, як мяркуецца, будзе ахоплена аздараўленнем прыкладна 200 тысяч дзяцей.

Дзённыя лагеры пры школах пачалі працаваць яшчэ 1 чэрвеня, а з 15 чэрвеня да іх далучыліся і стацыянарныя загарадныя летнікі. Супрацоўнікі лагераў у абавязковым парадку праходзілі тэсціраванне на «ковід» і знаходзіліся ў рэжыме самаізаляцыі перад заездам на работу. Усю змену яны не пакідалі тэрыторыю лагера і былі са сваімі роднымі толькі на анлайн-сувязі. Была таксама абмежаваная і колькасць бацькоўскіх дзён, каб зменшыць рызыку заносу ў дзіцячыя калектывы каранавіруснай інфекцыі. Напаўняльнасць стацыянарных лагераў не перавышала 80 працэнтаў. А вось павышаны попыт на дзённыя летнікі пры школах прывёў да таго, што яны працягвалі працаваць і ў жніўні.

Умовы знаходжання дзяцей у лагерах увесь час кантралявалі зацікаўленыя міністэрствы і ведамствы. Пастаянна праводзіўся прафілактычны маніторынг бяспечнага знаходжання дзяцей на аздараўленні, захавання ўмоў працы работнікамі арганізацыі. Колькасць зафіксаваных парушэнняў у параўнанні з мінулым годам скарацілася больш чым удвая.

Дзякуючы рэалізаванаму комплексному падыходу ў лагерах не было выяўлена ачагоў распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі, ніякіх надзвычайных сітуацый, хоць адзінкавыя выпадкі захворванняў на першай змене яшчэ рэгістраваліся.

Начальнік прадстаўніцтва Мінскага гарадскога ўпраўлення Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Валерый НАФРАНОВІЧ прывёў канкрэтны прыклад. 15 чэрвеня адбыўся заезд дзяцей. Адна сям'я ўтаіла той факт, што ў бацькі дзіцяці была павышаная тэмпература. 16 чэрвеня стала вядома, што ў дарослага «ковід». Затым інфіцыраванне пацвердзілася і ў дзіцяці. Давялося пратэсціраваць усіх выхаванцаў у атрадзе і педагагічных работнікаў. Больш ніхто не заразіўся, але гэты атрад быў ізаляваны ад іншых. Такім чынам, халатнасць дарослых дорага каштавала дзецям.

Валерый Нафрановіч дадаў, што ўсе лагеры былі забяспечаныя сродкамі індывідуальнай аховы і дэзынфекцыі. Былі распрацаваны алгарытмы процідзеяння пранікненню каранавіруснай інфекцыі, а таксама аказання адпаведнай медыцынскай дапамогі. У адрозненне ад папярэдніх гадоў у кожным медпункце вылучылі «чырвоную» зону з асобнымі ўваходам і выхадам. Атрады складаліся з 15 чалавек, масавыя мерапрыемствы праводзіліся толькі на свежым паветры.

— Калі мы ў пачатку года рыхтаваліся да аздараўленчага сезона, у мяне быў вельмі пазітыўны настрой, бо восем лагераў заявілі пра сваё жаданне працаваць у пяць змен. Такога яшчэ ніколі не было. На жаль, не ўсе планы выконваюцца. 16 нашых стацыянарных загарадных лагераў ужо завяршылі сваю работу, але 15 лагераў працуюць у чацвёртую змену і завершаць яе толькі 31 жніўня. Мяркуем, што ва ўсіх летніках (і дзённых, і стацыянарных з кругласутачным знаходжаннем) аздараўленне пройдуць у Мінску каля 40 тысяч дзяцей. У тым ліку сёлета мы арганізавалі аздараўленне 18 дзяцей з кардыяпаталогіяй і 36 дзяцей з цукровым дыябетам у суправаджэнні аднаго з бацькоў.

— Калі вы спытаеце, ці было нам складана, я адкажу шчыра: было няпроста ўсім, — канстатавала **начальнік аддзела сацыяльнай і выхаваўчай работы галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама Таццяна ЦВІРКО.** — Усе планавыя лічбы па аздараўленні давялося карэкціраваць па меры развіцця эпідсітуацыі ў Мінскай вобласці. Мы прынялі рашэнне распачаць аздараўленчы сезон у загарадных стацыянарных летніках з 1 ліпеня. Гэтае рашэнне аказалася правільным. На першым этапе адмовіліся ад арганізацыі палатачных лагераў, бо не былі ўпэўненыя, што там можна захаваць сацыяльнае дыстанцыраванне і нормы бяспекі. Самым галоўным для нас было стварыць спакойную атмасферу і ўсяліць у бацькоў упэўненасць у тым, што ў лагеры будзе створана бяспечнае і здаровае асяроддзе. І педагогі, і медыкі, і работнікі, якія забяспечвалі харчаванне дзяцей, — усе былі пастаўлены ў дастаткова складаныя ўмовы, таму я ўдзячная кожнаму супрацоўніку, які дапамагаў арганізаваць бяспечнае лета для нашых дзяцей.

Мы адышлі ад масавых мерапрыемстваў і зрабілі іх больш утульнымі, атраднымі, ад чаго выхаваўчы працэс дакладна не прайграў. У нас дзейнічае 25 стацыянарных лагераў, з іх 19 належаць сістэме адукацыі Міншчыны. Сёлета ўпершыню прыняў дзяцей лагер «Буравеснік», які з'явіўся ва Уздзенскім раёне на базе ўстановы адукацыі, што закрылася: ён знаходзіцца не ў межах населенага пункта, а ў вельмі жывапіснай прыроднай зоне. Пасля капітальнага рамонту сталоўкі адкрыўся лагер «Арляня» ў Нясвіжскім раёне. Дзейнічаў летам таксама 41 лагер працы і адпачынку з дзённым знаходжаннем, дзе змаглі папрацаваць каля 550 падлеткаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сямейная газета

Выпуск № 16 (152)

ЦЯЖКА БЫЦЬ ДЗІЦЕМ?

...У першыя гады самастойнага дарослага жыцця здавалася: як добра быць дзіцем! Ніякіх табе сур'ёзных турбот, абы, як казалі бабулі, не краў і добра вучыўся. Узорна сябе паводзіш — чакай у Новы год падарункі ад Дзеда Мароза. Дый нават калі не ідэальна, усё адно чакай, авансам, Дзед чараўнік спагадлівы. Маме дапамагаеш — малайчына. «Пяцёрку» са школы прыносіш — цудоўна, «тройку» — нічога страшнага, выправіш. Зноў жа, канікулы чатыры разы на год, а ўлетку, загуляўшыся з сябрамі-прыяцелямі, можна заходзіць дамоў толькі паабедаць і спаць... Не жыццё — маліна!

Але рана ці позна стадыя зайздрасці і некрытычнай настальгіі праходзіць. Калі ж з'яўляюцца ўласныя дзеці, ты нібыта пражываеш дзяцінства наноў — але ўжо з адваротнага боку, заўважаючы не толькі яго бесклапотныя радасці, але і падводныя камяні, перыядычна параўноўваючы «тады» і «цяпер» і часам прыходзячы да высновы, што нам было прасцей жыць.

У маім дзяцінстве, напрыклад, не было «развівашак» для дашкольнікаў, але затое ніхто не патрабаваў ад нас умець чытаць і пісаць яшчэ да паступлення ў першы клас. Нават у песеньцы захаваўся напамін: «Літары розныя пісаць... вучаць у школе». Цяпер жа, прынамсі ў сталіцы, для бацькоў звычайная справа — за год весці дзяцей на падрыхтоўчыя курсы, дзе і чытанне, і «Я спазнаю свет», і асновы матэматыкі, і англійская.

...Мама тэлефанавала з работы адзін раз на дзень, каб пераканацца, што мы паелі і зрабілі ўрокі. Сёння кантрольныя званкі дзецям — неад'емная частка выхаваўчага працэсу. Спытала ў тых, хто ў дзяцінстве ездзіў праз паўгорада на розныя секцыі і гурткі з ключом на шыі, ці многія з іх адпускаюць сваіх дзяцей займацца на тых жа ўмовах? Тройчы ха-ха! Без мабільніка ў кішэні ці смарт-гадзінніка на руцэ не выпраўляюць практычна нікога. Хтосьці стэлефаноўваецца з бацькамі ў загадзя вызначаны час, кагосьці «перадаюць» адзін аднаму бацькі і педагогі, кагосьці нават «вядзе» GPS-трэкер, а выпадкова забыты дома тэлефон і адпаведна згубленая на нейкі час сувязь — нагода для панікі ці скандалу.

...У нас не было сваякоў і бабуль у вёсцы, таму звычайна частка летніх вакацый праходзіла ў «заводскім» піянерлагеры, і праз адну-дзве змены заўсёднікі, дзеці завадчан, пачуваліся ўжо як дома. Я дагэтуль магу намаляваць схему нашага летніка і прыгадаць імёны-прозвішчы «галоўных людзей» — начальніка, любімых важатых і сваіх суатраднікаў, ды-джэя і кіраўніка творчых гурткоў. Цяпер, скажам шчыра, колькасць загарадных летнікаў куды меншая, і набор у іх ідзе па іншых прынцыпах, таму знікла такое каштоўнае адчуванне «свойскасці» — дзеці падтрымліваюць стасункі ў лепшым выпадку год-другі, потым разыходзяцца, як у моры караблі, і жывуць кожны сваімі інтарэсамі. Да таго ж сёлета праз неспрыяльныя эпідэміялагічныя ўмовы «бацькоўскія дні» ператварыліся ў сустрэчы цераз агароджу, без магчымасці абняцца і паказаць усе патаемныя і любімыя месцы — якая ўжо тут радасць?

Сёлета дзецям наогул давялося няпроста, магчыма, нават больш, чым нам. Вясновыя канікулы для многіх перайшлі акурат у самаізаляцыю, выпускныя ў садках і школах вымушана адмяніліся, забаўляльныя цэнтры і культурныя ўстановы зачыніліся, з планаў на лета ў многіх «выпала» паездка на мора ці ў вёску да бабулі... Альтэрнатыў засталося насамрэч няшмат — дом, вуліца, гаджэты; калі пашанцавала з водпускам бацькоў — вылазкі на дачу ці на прыроду. І тым не менш дзеці справіліся: самі ці з дапамогай дарослых знайшлі сабе занятак, назапасілі сонца і ўражанняў, выраслі з усіх запасаў адзення і абутку і будуюць планы на блізкую ды аддаленую перспектыву. Яны прабіваюць свае шляхі, «прарастаюць», нібы кветкі праз асфальт. І я разумею, што гэтай дзіцячай неўтаймоўнасці, аптымізму і ўменню марыць без межаў варта павучыцца, па магчымасці падтрымаць, а калі не ўмееш — проста не перашкаджаць.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Азбука прафесій

ЗРАБІЦЕ МНЕ СМАЧНА,

або Мая мама — кандытар!

Мінчанка Кацярына МАРОЗАВА прыйшла ў «салодкую» прафесію адразу пасля тэхнікума, пазней атрымала вышэйшую адукацыю тэхнолага ў Магілёўскім універсітэце харчавання, і вось ужо 16 гадоў працуе кандытарам — на дзяржпрадпрыемствах і ў прыватных пякарнях, у сетцы грамадскага харчавання і супермаркетах і, канешне, на ўласнай кухні. То-бок яна не проста ведае, чым адрозніваюцца макаронсы, яны ж макаруны, ад макароны, а бланманжэ ад жэле, што такое ганаш, айсінг, ізамальт, крамбл, парфэ, тарт і іншыя тры старонкі слоўніка кулінарных тэрмінаў, а і ўмее гэта рабіць — смачна і прыгожа. Паразважаць для «СГ» пра ўлюбёныя дэсерты і нюансы прафесіі кандытара разам з Кацярынай узяўся яе 10-гадовы сын Дзіма.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Юрыдычная кансультацыя

ПРАЗ ПАТУРАННЕ СВАЯКОЎ І З ІХ УДЗЕЛАМ

Калі ахвяры — дзеці...

У міжнароднай практыцы існуе толькі два віды права, якія ў прынцыпе не могуць падпадаць пад нейкае абмежаванне з чыйго-небудзь боку, у тым ліку з пазіцыі дзяржавы. Гэта забарона катаванняў і рабства ў любой форме. Аднак насамрэч гэтыя правы ігнаруюцца і парушаюцца ледзьве не паўсюдна і на розных узроўнях. Пытанні прававой рэгламентацыі абароны дзіцяці на вэбінары «Аказанне юрыдычнай дапамогі дзецям, якія пацярпелі ад гвалту (у тым ліку гандлю людзьмі і звязанага з ім злачынства)» акрэсліў адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Дзмітрый ЛЕПРЭТАР. Прававыя анлайн-мерапрыемствы пры падтрымцы пасольства Вялікабрытаніі ладзіў Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі сумесна з Беларускай рэспубліканскай калегіяй адвакатаў (БРКА).

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

ПРАЗ ПАТУРАННЕ СВАЯКОЎ І З ІХ УДЗЕЛАМ

БЕЗ ЗГОДЫ БАЦЬКОЎ

Насілле над дзецьмі — шматгранная з'ява, якая ўключае ў сябе розныя аспекты псіхалагічнага і фізічнага гвалту, што можа адбывацца ў школе, на вуліцы і нават дома.

— У артыкуле 32 Канстытуцыі сказана, што сям'я, шлюб, мацярынства і бацькоўства знаходзяцца пад абаронай дзяржавы. Бацькі або асобы, якія іх замяшчаюць, павінны клапаціцца пра выхаванне малых, іх здароўе і навучанне. Дзіця не мусіць падвяргацца жорсткаму абыходжанню або зневажанню, прыцягвацца да работ, якія могуць нашкодзіць яго фізічнаму, маральнаму ці разумоваму развіццю, — акрэсліў Дзмітрый Лепрэтар. — Насілле супраць дзяцей — досыць латэнтнае злачынства, якое складана выявіць і пасля прадставіць доказы, бо хатні гвалт у асноўным здзяйсняюць сваякі і члены сям'і.

Канвенцыя аб правах дзіцяці, прынятая ў 1985 годзе і ратыфікаваная Беларуссю (у прыватнасці, артыкулы 13, 16, 27, 34, 35, 36, 37), таксама закліканая абараняць малых ад гвалту.

Як працяг Канвенцыі ў нас дзейнічае закон аб правах дзіцяці, дзе таксама гаворыцца пра забарону бесчалавечнага стаўлення. Акрэслена, як дзіця само можа абараняць свае правы: папрасіць зрабіць гэта сваіх бацькоў ці апекуноў або самастойна. Адвакат заўважае:

«Што датычыцца булінгу і цкавання ў інтэрнэце, то, як правіла, яно з'яўляецца вынікам пераследу дзіцяці ў школе».

— Падлетак, якому споўнілася 14 гадоў, мае права на атрыманне юрыдычнай дапамогі (згодна з артыкулам 13 Закона аб правах дзіцяці) ад спецыялістаў для абароны сваіх законных правоў і інтарэсаў без згоды бацькоў. Пры гэтым заканадаўча прадугледжана, што юрыдычная дапамога дзецям у іх інтарэсах аказваецца бясплатна за кошт сродкаў БРКА.

ПРАДПІСАННЕ СУПРАЦЬ ГВАЛТУ

Артыкул 17 Закона аб правах дзіцяці ў кантэксце хатняга гвалту прадугледжвае, што бацькі ці апекуны нясуць адказнасць за неправамерныя спосабы выхавання, у прыватнасці за выкарыстанне фізічнай сілы. А ў артыкуле 137 у дачыненні да дзяцей існуе асаблівая норма, якая забараняе прымусовае перамяшчэнне малых, у тым ліку праз мяжу.

— У Беларусі ёсць таксама профільны закон, які прымяняецца ў адносінах да непаўналетніх. Ён змяшчае такое паняцце, як абароннае прадпісанне. Калі ў сям'і адбываецца хатні гвалт у дачыненні да іншых яе членаў, то ў выпадку неаднаразовага прыцягнення гвалтаўніка да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці органы ўнутраных спраў могуць вынесці абароннае прадпісанне, дзе ўкажуць абмежаванні адносна здзяйснення тых ці іншых дзеянняў у дачыненні да ахвяры насілля.

Дакументам могуць абмяжоўвацца, напрыклад, спробы крыўдзіцеля знайсці дзіця, якое з другім з бацькоў знаходзіцца ў прытулку, а таксама наведванне гэтага месца, стасункі праз тэлефон і інтэрнэт. З дапамогай абароннага прадпісання можна абмежаваць і месца жыхарства самога агрэсара, вымусіць яго пакінуць памяшканне, дзе ён жыў з сям'ёй, якую зневажаў, і забараніць яму распараджацца агульнай уласнасцю. Праўда, тэрмін дзеяння прадпісання абмежаваны — ад 3 да 30 сутак. За гэта час органы апекі павінны дапамагчы сям'і вырашыць сітуацыю.

— Выдача абароннага прадпісання магчымая толькі з пісьмовай згоды паўналетняга члена сям'і, які пацярпеў ад хатняга гвалту. Калі такую згоду немагчыма атрымаць, бо пацярпелая асоба знаходзіцца ў залежным ад агрэсара стане (напрыклад, гвалтаўнік — адзіны здабытчык), то абароннае прадпісанне з такімі ўмовамі можа зацвердзіць пракурор, — звярнуў увагу

Дзмітрый Лепрэтар. — Звычайна гэты дакумент ініцыюе кіраўніцтва раённага ўпраўлення ўнутраных спраў.

Калі пацярпелы ад насілля паўналетні адмаўляецца ад прыцягнення вінаватага да адказнасці, то далей усё залежыць ад складу злачынства. Ёсць справы, якія можна распачаць толькі па заяве пацярпелага. Але возьмем 153-і артыкул Крымінальнага кодэкса адносна прычынення лёгкіх цялесных пашкоджанняў. Нават калі крымінальная справа скончылася ў сувязі з прымірэннем бакоў, то пры паўтарэнні падобнай сітуацыі можна выпісаць абароннае прадпісанне.

— Перашкодай да звяртання са скаргай на хатні гвалт з'яўляецца таксама страх, што дзіця трапіць у катэгорыю тых, хто знаходзіцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы. Праз гэта змяншаецца працэнт зваротаў рэальных ахвяр насілля, — удакладніў адвакат.

ГЭТА ЛІЧЫЦЦА ГАНДЛЕМ ЛЮДЗЬМІ

Беларусь ратыфікавала некалькі профільных міжнародных канвенцый, у прыватнасці Канвенцыю Савета Еўропы аб супрацьдзеянні гандлю людзьмі. Для развіцця сваіх міжнародных абавязкаў Беларусь прыводзіць нацыянальнае заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі.

— Злачынствы, якія звязаны з гандлем людзьмі, падпадаюць пад набор артыкулаў Крымінальнага кодэкса Беларусі, аднесеных да гэтай сферы. Прымус да заняткаў прастытуцыяй, стварэнне ўмоў для яе, выкарыстанне рабскай працы, выкраданне, незаконныя дзеянні, скіраваныя на працаванне за мяжой, стварэнне і распаўсюджванне парнаграфічнай прадукцыі з выявамі непаўналетніх, — кажа Дзмітрый Лепрэтар. — Гандаль людзьмі — гэта вярбоўка, перавозка, перадача, укрывальніцтва або атрыманне чалавека з мэтай яго эксплуатацыі, якое дасягнута шляхам падману, злоўжывання даверам ці здзейснена пад пагрозай насілля.

Калі ж вярбоўка, перавозка, перадача, укрывальніцтва або ўтрыманне чалавека з мэтай эксплуатацыі датычацца непаўналетняга, то **гэта лічыцца гандлем людзьмі (крымінальным злачынствам) нават у тым выпадку, калі асобу, што не дасягнула 18 гадоў, не падманвалі і не пагражалі ёй,** падкрэсліў адвакат. Дарэчы, эксплуатацыя — гэта незаконны прымус чалавека да работы па аказанні паслуг, у тым ліку сексуальных, сурагатнага мацярынства, забору органаў і тканак, калі ён не можа адмовіцца ад гэтага.

Калі чалавек можа даказаць, што з'яўляецца ахвярай гандлю людзьмі, ён мае права на рэабілітацыю і бясплатную юрыдычную дапамогу. Адвакат у гэтым выпадку атрымае грошы за сваю работу ад калегіі.

ГРУМІНГ І ЦКАВАННЕ Ў РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

У сучасным свеце насілле можа мець таксама віртуальныя формы праз стасункі дзіцяці ў інтэрнэце, якія з часам могуць прыняць рэальныя абрысы. Сачыць за тым, чым займаецца дзіця ў сеціве, павінны перш за ўсё бацькі, мяркуе адвакат:

Калі заўважаеш праявы цкавання і зневажання дзіцяці, перш за ўсё трэба клапаціцца пра яго інтарэсы, намагаючыся яму дапамагчы, а не дбаць пра рэпутацыю школы.

— Што датычыцца булінгу і цкавання ў інтэрнэце, то, як правіла, яно з'яўляецца вынікам пераследу дзіцяці ў школе. Настаўніку трэба сачыць, што адбываецца ў класе. Таксама неабходна працаваць з сем'ямі — дзіцяці, якога цкуюць, і тых, хто цкуе.

Яшчэ адна праява сучаснасці — грумінг, калі дзіця вымушаюць выказаць пэўную сексуальную актыўнасць праз інтэрнэт. Былі нават спробы замацаваць паняцце грумінгу заканадаўча, аднак прыцягнуць да адказнасці за гэтыя супрацьпраўныя дзеянні вельмі праблематычна. Часта дзіця ўжо само расказвае пра гэта аднагодкам у школе, а тыя — бацькам, абазначыў Дзмітрый Лепрэтар.

Дзеці часта высвятляюць адносіны паміж сабой, і здараюцца розныя праблемныя сітуацыі, якія перарастаюць у насілле. Гэта можа быць і парваны заплечнік, і плёткі ды абразы ў сацыяльных сетках. Бывае, што дзіця спачатку само праяўляла насілле, а пасля пацярпела і стала ахвярай высвятлення адносін. «Што можна параіць рабіць бацькам, калі яны даведваюцца, што ў дачыненні да іх дзіцяці ўжываецца псіхалагічны і фізічны гвалт?» — пацікавіўся ў адваката **мадэратар мерапрыемства Дзмітрый ШЫЛІН, старшы каардынатар па пытаннях аховы дзяцінства Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі.**

— Калі гэта адбываецца ў школе, трэба звязвацца з яе кіраўніцтвам, прычым лепш зрабіць гэта пісьмова і зарэгістраваць зварот, каб ад падаўца скаргі не маглі адмахнуцца, — параіў адвакат. — Атрымаўшы афіцыйны адказ і не пагадзіўшыся з гэтым дакументам, ужо можна ісці вырашаць праблему ў вышэйшыя інстанцыі. Хоць звычайна кіраўніцтва школы стараецца купіраваць праблему на сваім узроўні праз педсаветы, ушчуванні, размовы і іншыя меры ўздзеяння, якія не маюць юрыдычных наступстваў для агрэсара і яго сям'і. Калі гэта не дапамагае, надыходзіць чарод камісіі па справах непаўналетніх. Крымінальная адказнасць у Беларусі пачынаецца з 16 гадоў па агульных справах, а па асабліва цяжкіх — з 14. Адміністрацыйная адказнасць настае таксама з 16 гадоў. Пры гэтым варта памятаць, што за ўчынкі дзяцей адказваюць і іх бацькі. Гэта таксама можа быць рычагом вырашэння школьнай праблемы.

Калі дзіця стала аб'ектам цкавання ў інтэрнэце, ахвярай анлайн-насілля, у тым ліку звязанага з гандлем людзьмі, можна звярнуцца да спецыялістаў па кансультацыю на сайце kids.pomogut.by, а таксама ананімна і бясплатна пазваніць на нумары 8 801 100 16 11 (кругласутачна) або 8 801 201 55 55 (з 8.00 да 20.00).

КАЛІ ХОЧАШ ДАПАМАГЧЫ...

Часта сведкамі насілля могуць стаць суседзі, хоць заяў ад бацькоў няма, а дзіця запужалі. Аднак няма нейкіх універсальных парад, як зрабіць лепш, бо кожная сітуацыя — асаблівая і канкрэтная. Акрамя таго, існуе яшчэ і элемент сузалежнасці, і немагчыма прадказаць, што будзе пасля таго, як падаць скаргу, а пасля забраць заяву. Гэта, пэўна, ужо больш справа педагогаў і псіхолагаў. У любым выпадку, калі заўважаеш праявы цкавання і зневажання дзіцяці, перш за ўсё трэба клапаціцца пра яго інтарэсы, намагаючыся яму дапамагчы, а не дбаць пра рэпутацыю школы ці яшчэ нейкія моманты, параіў напрыканцы адвакат і нагадаў, што далёка не кожнае дзіця пойдзе да адваката скардзіцца на сваякоў ці аднагодак.

Арганізацыя ЮНІСЭФ удзяляе асаблівую ўвагу пытанням прававой падтрымкі і юрыдычнай абароны інтарэсаў непаўналетніх, таму, акрамя юрыдычных вэбінараў, у Беларусі арганізавана анлайн-кансультаванне для дзяцей і бацькоў па праблемах шлюбна-сямейных адносін праз чат-бот у «Тэлеграме» @kids_lawyer_bot.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

ЗРАБІЦЕ МНЕ СМАЧНА...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Ці ведаеш, чаму мама абрала прафесію кандытара?

Дзіма: Не-а. Напэўна ж, у дзяцінстве любіла салодкае — есці і гатаваць.

Кацярына: Насамрэч усё больш празаічна: каледж хлебапячэння знаходзіўся за два прыпынкі ад дома. *(Смяецца.)* Варыянт гандлёвага каледжа таксама разглядала — але, па-першае, быў ён далёка, а па-другое, душа не ляжала да лічбаў, да продажаў — магчыма, як разавы вопыт было б цікава, але дакладна не як прафесія на ўсё жыццё. У школе было ўжо нецікава заставацца на 10—11 клас — вырашыла, што каледж стане базавай адукацыяй, з якой магу рухацца далей. Але пасля 9-га выбар прапанаваных прафесій быў небагаты: цырульнік, швачка, будаўнічы тэхнікум, педагагічны, ну, і хлебапячэнне. Падумала пра апошняе: чаму б не — і прыгожа, і смачна, і ў любым выпадку знайду работу, бо хлеб усім патрэбны.

Хоць, натуральна, гатаваць розныя прысмакі наша гераіня таксама любіла. Згадвае: па нядзелях традыцыйнай сямейнай стравай былі бліны, а з бюджэтных і простых дэсертаў — торт «Негр» на аснове кефіру і варэння, печыва «Цыгарэты», хрумсткае «Галлё», маргарынавае печыва «Хрызантэма», цеста для якога круцілі на мясарубцы, тварожны дэсерт «Домікі», самаробны «Напалеон»... «У нас была цяжкая чыгунная форма для печыва ў форме вавёрак, грыбоў і арэшкаў, але яго рабілі нячаста, бо па рэцэпце патрабаваліся сметанковае масла і згушчонка — у 90-я для сям'і з трыма дзецьмі не самыя даступныя прадукты, да таго ж печыва выходзіла да крыўднага мала, — згадвае Кацярына. — Тым не менш мы з сёстрамі часта эксперыментавалі з прыгатаваннем іншых ласункаў, хоць і не заўжды атрымлівалася, — помню, аднойчы выйшла такое дубовае печыва, «жах стаматолага», зрэшты, як нам тады здавалася, гэта было смачна...»

Дз.: Я таксама спрабаваў сам працаваць з цестам — неяк рабіў з салёнай пластычнай масы танк, але дабавіў вельмі многа вады, і атрымалася лухта, а не танк. Таму мне больш падабаецца дапамагаць старэйшым — ляпіць пячэнне з ужо гатовага цеста, замешваць бліны, узбіваць крэм... Мая бабуля вельмі любіць гатаваць шакаладны торт са смятанай, надзвычай смачны, — і я далучаюся. Ну і потым лыжкі-міскі аблізаць — абавязкова!

— Калі не памыляюся, Дзіма ў дзяцінстве марыў стаць пажарным, вайскоўцам, футбалістам... А стаць кандытарам — мільгала такая думка?

Дз.: Ой, якіх толькі думак у мяне не мільгала. *(Уздыхае.)* Калі ўпершыню пакаштаваў сасіску ў цесце, зразумеў, як гэта крута, і вырашыў стаць кухарам. А наконт кандытара — гэта, безумоўна, смачна і прыгожа, але я не ўпэўнены.

К.: Паспрабаваць сябе ў гэтай сферы можна, таму, напрыклад, калі Дзіма захоча на адпаведныя 3-6-месячныя курсы, я падтрымаю. Але каб сур'ёзна выбіраць прафесію з перспектывай стаць тэхнолагам і займацца гэтым шмат гадоў — сумняюся, калі шчыра, мяркую, што ён сам расчаруецца. Бо паветраныя замкі і мары стварыць торт-шэдэўр развейваюцца ў рэальнасці даволі хутка.

— Многія перакананы, што найлепшыя кухары — мужчыны. А ў кандытараў ёсць гендарны перакос?

К.: Прыйсці ў прафесію можа кожны, незалежна ад полу — хоць жанчына, хоць мужчына: калі ў чалавека, напрыклад, ляжыць душа да шакаладу альбо ён любіць і ўмее маляваць, упрыгожваць — магчыма, ён створыць шэдэўральны дэкор ці распісныя пернікі. Сярод кухараў і пекараў насамрэч вельмі многа мужчын, у «хлебе» засталіся многія мае знаёмыя. Але калі згадваць месцы, у якіх я працавала, мужчын там практычна не сустракала — хіба на кіруючых пасадах, дый у нашай студэнцкай групе на 29 дзяўчат быў адзін (!) хлопец, і той, што называецца, паступіў «праз маму» і не працаваў па спецыяльнасці ніводнага дня. Ёсць прыклады кандытарскіх геніяў-мужчын, кшталту папулярнага расійскага шэфа Рэната Агзамава, які і кулінар, і повар, і кандытар, і саўладальнік цэлай кандытарскай фабрыкі. Аднак іх усё ж вельмі мала. Асабіста мне не сустракаліся мужчыны, гатовыя адказна і скрупулёзна займацца дэкорам кандытарскіх вырабаў — галіначкі размарыну ўваткнуць у пірожнае і лісточкі расправіць, ледзьве не пінцэтам цукровыя бусінкі ў пэўным парадку раскласці, фігуркі да дробязяў вылепіць і гэтак далей.

— Што самае складанае ў прафесіі кандытара?

Дз.: Як мне здаецца, гэта «выгатаўліванне» і прапрацоўка дробных дэталяў, пра што мама казала. Вось пячэш ты сто кексаў, і трэба, каб у кожным былі тры мармеладкі, кветка і дзесяць арэшкаў — звар'яцець можна, пакуль усё раскладзеш.

К.: Калі браць не стандартныя кандытарскія вырабы — булкі, кексы, слойкі, — а эксклюзіўныя, то вельмі складана бывае знайсці агульную мову непасрэдна з кліентам. Пачынаючы ад банальнага «зрабіце мне смачна» — чалавек сабе ў галаве нешта ўяўляе, з чаго складаецца і як мусіць выглядаць тое «смачна», ужо літаральна адчувае чаканы смак на языку, а ты ж не бачыш і не разумееш, што ён мае на ўвазе: шакаладны бісквіт з тварожным крэмам і вішняй, шпінатныя каржы, торт «Казка» ці «Чырвоны аксаміт»? Альбо кліент сам не ведае, чаго яму хочацца, а я ж тым больш не ведаю, тады губляюся... Калі прыходзіць чалавек і канкрэтна кажа: «Мне бісквіт, бялковы крэм, мноства ягад і ніякага арахісу», папярэджвае пра алергію на пэўныя прадукты — гэта шчасце, бо разумееш, у якім кірунку можаш рухацца, а чаго не трэба і пачынаць. Таксама складана прасачыць лагістыку ад пачатку да канца і быць упэўненым, што твой торт альбо пірожныя трапяць да заказчыка менавіта такімі, якімі ты іх зрабіў. Бываюць нюансы «хачу свежыя трускалкі ў лістападзе» альбо «хурму ў ліпені», «гранат у жніўні» — тады тлумач, што свежага не будзе і варта замяніць іншым прадуктам альбо будзе замоўлены, ды па завоблачнай цане. Бывае «зрабіце мне трох'ярусны торт, але мы не самі па яго прыйдзем, прывязіце на гэты адрас» — і хоць ты сам рабіся «выязным кандытарам» і адпраўляйся разам з кіроўцам, каб забяспечыць захаванасць ласунку ці пры неабходнасці «сабраць» яго на месцы. Няпроста і задаволіць патрабаванні начальства — прыдумаць што-небудзь новае, чаго няма ў інтэрнэт-рэцэптах, эксклюзіўнае, але недарагое, ці аднавіць старое, але на новы лад, і зноў жа каб было нядорага, лёгка транспартавалася і добра прадавалася. Ну ўявіце: папулярныя пірожныя макароны вырабляюцца з міндальнай мукі, цукровай пудры, бялкоў, з выкарыстаннем якаснага гелевага фарбавальніку — але гэта ўсё інгрэдыенты нятанныя. Тады прапануюць узяць звычайную пшанічную муку, звычайны фарбавальнік і варэнне — ды калі ласка, толькі ў вас атрымаецца не макарон, а штосьці зусім іншае... Дагадзіць усім — задача невыканальная. Калі адносіцца да торту як да святочнага атрыбуту, напрыклад, на вяселлі, то галоўнае — яго прывабны, эфектны знешні выгляд, туды пхаюць і лялькі, і жывыя кветкі, і ўсё на свеце, а калі торт — ласунак, які вы хочаце з'есці, то важна тое, што ўнутры. Ведаю, што некаторыя людзі замаўляюць торт з масцікай проста для таго, каб дзіця палюбавалася на карцінку, а потым масціку здымаюць і ядуць сам дэсерт, але ёсць і тыя, хто ўпарта есць масціку, як нейкі ласунак, — а гэта, па сутнасці, проста цукар, фарбавальнік і крухмал, у якіх ні карысці, ні смаку. Мне больш даспадобы мода апошніх некалькіх гадоў, калі торт заглазураваны са знарочыстай нядбайнасцю, так, што прасвечваюцца каржы. Затое ты бачыш, з чаго яны зроблены, якая ўнутры праслойка (і што яна там увогуле ёсць, а не як у амерыканскіх кулінарных шоу — таўшчэзны бісквіт, проста абмазаны крэмам).

— Тады што для кандытара самае прыемнае?

Дз.: З'есці тое, што ты зрабіў! І канешне, усведамляць, што нейкі складаны дэсерт ты прыгатаваў ці нават прыдумаў сам, што ты займаешся любімай справай і прыносіш сабе і людзям радасць.

К.: Самае прыемнае — калі прыходзяць кліенты і кажуць: «Дзяўчаты, дзякуй вялікі — было вельмі смачна!» Калі ў кандытарскую групу ў месенджары скідваюць водгукі-кампліменты ад заказчыкаў — за некаторыя высокія ацэнкі ад важных і патрабавальных кліентаў насамрэч могуць даць прэмію. Калі твае дэсерты так спадабаліся людзям, што рэкамендуюць іншым, прыходзяць замаўляць зноў і зноў, нягледзячы на цану, проста таму, што табе давяраюць.

— Сёння ў крамах, кавярнях, пякарнях такая разнастайнасць — вочы разбягаюцца. Хтосьці каштуе ўсё новае, хтосьці не здраджвае ўлюбёным ласункам. А ў вас ёсць такія?

Дз.: Не, у нас кожнаму падабаецца штосьці сваё. Маё самае любімае — пірожнае «Бульбачка», яно вельмі смачнае, і яшчэ шчарбет з арэхамі.

К.: Гм, нават не ведаю... Калі проста зараз мяне завялі б у кандытарскую і сказалі выбіраць, выбрала б торт «Ленінградскі». Усё меркне ў параўнанні з ім, бо гэта цёплыя ўспаміны з дзяцінства.

— А што з кандытарскіх вырабаў, наадварот, вы ніколі не сталі б есці?

Дз.: Бабуля аднойчы пачаставала зефірам са смакам імбіру — на мой густ, рэдкая гадасць. І салодкая запяканка ды пірагі з гарбузом катэгарычна не спадабаліся.

К.: Я не стала б есці тое, што афармлена з сумнеўным пачуццём гумару — пірожныя і тарты ў выглядзе жывёлы альбо часткі цела, тарты з празмернай колькасцю масцікі і дзікімі адценнямі фарбавальніку — напрыклад, чорна-зялёны, у стылі Хэлаўіна... Дарэчы, акрамя традыцыйных святочных заказаў на Новы год, 14 лютага, 23 лютага, 8 сакавіка, у нас быў летась тэматычны «хэлаўінскі» заказ, і для мяне стала адкрыццём, што ў нас гэтае свята маштабна адзначаюць не ў сям'і, а ў многіх офісах. Мы прыгатавалі дзясяткі пірожных-гарбузікаў, «чарвякоў у зямлі», «мазгі» са шпрыцамі — прычым шпрыцы былі сапраўдныя, толькі ўнутры сіроп, «адсечаныя пальцы», «разбітае шкло» і іншыя страшылкі.

— Кандытар — прафесія, з якой можна шмат зарабіць?

Дз.: Калі старацца-старацца-старацца і працаваць штодня не па тры гадзіны, а па шэсць-восем і ўвесь час удасканальвацца, то, думаю, можна.

К.: Шэсць-восем, ага — можа, дзесяць-дванаццаць? Мяркуючы па аб'явах, спецыялісты майго профілю патрабуецца ўвесь час, але гэта сведчанне толькі вялікай цякучкі ў прафесіі, а не таго, што яна прыбытковая. Калі ты адзін, без сям'і і дзяцей, гатовы выйсці на работу ў любы момант, замяніць іншага — адпаведна, заробіш больш. З тых, хто працуе на сябе, зарабляюць нямногія — перадусім тыя, хто пачаў рабіць штосьці першы альбо прапануе вырабы, якіх не знойдзеш у канкурэнтаў. Але трэба мець на ўвазе, што ў Беларусі кандытарскі рынак не надта шырокі, таму рана ці позна ўсе нішы запаўняюцца, а некаторыя кірункі могуць наогул «не пайсці» — як, скажам, модныя веганскія дэсерты, за якія многія браліся, але гэтаксама многія адмаўляліся, бо сегмент пакупнікоў невялікі, а прадукцыя часта неабгрунтавана дарагая. А вось, напрыклад, першая беларуская майстэрня шакаладу з Ліды «выстраліла», бо гэта не проста ручная работа, а самастойны выраб прадукту, ад смажання какава-бабоў да рэцэптуры і ўпакоўкі шакаладу.

— Апішыце ў трох словах: які ён, кандытар?

К.: Цярплівы, гнуткі і творчы.

Дз.: У трох словах? Вельмі смачная прафесія. Але можна моцна растаўсцець. А калі падбіраць канкрэтныя эпітэты, то кандытар — нястомны, цярплівы і добры.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота аўтара і з архіва сям'і МАРОЗАВЫХ.

Нататкі шматдзетнага таткі

☺ ☺ ☺

Зусім выпадкова купіў сёння шыкоўную кнігу «Вынайдзена ў СССР». І ў адной з першых глаў, прысвечаных вынаходніку метаду падводнай (мокрай) зваркі Канстанціну Хрэнаву, натрапіў на цікавую дэталь: аказваецца, К. Хрэнаву, які ў далейшым стаў акадэмікам, дазволілі ў парадку выключэння падпісвацца ў сваіх навуковых работах «Хрэнаў К. К., акадэмік», а не «акадэмік Хрэнаў», як павінна было быць па правілах. Памойму, гэта вельмі забаўна. Я і не ведаў, што ў фразы «акадэмік хрэнаў» быў цалкам рэальны прататып. Які быў на самай справе выдатны вынаходнік, а зусім не хрэнаў. Дакладней, Хрэнаў з вялікай літары :-)

☺ ☺ ☺

Гулялі з дзецьмі па цэнтры Каўнаса, зайшлі ў «Хесбургер» (фінскі фастфуд). Перакусілі, выйшлі на вуліцу. Я выйшаў апошні, бо прыбіраў за ўсімі падносы. Гляджу — двайняткі стаяць на тратуары і заліваюцца смехам.

Пытаюся:

— Вы чаго рагочаце?

— А мы Ксенію навучылі каманды выконваць.

— Якія яшчэ каманды?

— А вось глядзі: Ксенія, сядзець!

Ксенія паслухмяна села на кукішкі.

— Ксенія, голас!

Ксенія на ўсю вуліцу выразна:

— Гаў!

Сорамна прызнацца, нават я разрагатаўся.

Поля працягвае ёй бульбачку фры:

— Малайчына, Ксенія, трымай бульбачку.

Самае смешнае, што ў «Хесбургеры» яна гэту ж бульбачку есці адмовілася, а тут упісвала за мілую душу. Таму што адна справа бульба бясплатная, і зусім іншая — сумленна зароблена.

☺ ☺ ☺

Едзем з дзецьмі ў машыне, на небе свеціць поўня. Ксенія *(захоплена)*:

— Месяц!

Кажу дзецям:

— Дзеці, а вы ведаеце, што месяц да нас заўсёды павернуты адным бокам?

Сын:

— А ведаеш чаму?

— Пэўна, таму, што ён не круціцца вакол сваёй восі.

— Не зусім. Месяц не круціцца адносна геацэнтрычнай арбіты, а адносна геліяцэнтрычнай ён круціцца.

Марта:

— Вось цяпер усё зразумела! Бачыш, тата, як проста?

Так, уменне растлумачыць складаныя рэчы простымі словамі — гэта таксама талент.

☺ ☺ ☺

Вера робіць матэматыку:

— Тата, а колькі будзе трыццаць два падзяліць на чатыры?

Я:

— Не ведаю.

Вера:

— Поля, а ты ведаеш?

Я:

— Поля, не кажы ёй, няхай сама думае.

Поля *(загадкава)*:

— Магу падказаць табе толькі першую лічбу.

Я зацікавіўся і кажу:

— Дазваляю падказаць першыя дзве.

Поля *(здзіўлена)*:

— Тата, ты ж сам сказаў не гаварыць адказ!

Вось такі парадокс...

☺ ☺ ☺

Жонка пытаецца ў двайнят:

— Ну што, дзеці, даведаліся адзнакі па кантрольнай?

(У іх пазаўчора кантрольная па беларускай была.)

Вера:

— У мяне восем.

— Малайчына. А ў Полі што?

Поля *(няпэўна)*:

— У мінулым стагоддзі гэта была вельмі добрая адзнака...

Павел ХОЛАД.

Зноў пра любоў

СТАТУС: У АКТЫЎНЫМ ПОШУКУ

Як жанчыне адшукаць каханне з дапамогай сайтаў знаёмстваў?

Да сайтаў знаёмстваў у нас прынята ставіцца з прадузятасцю. І дарэмна. Сёння не знаёмяцца ў грамадскім транспарце, тэатрах, парках і чытальных залах. Па сутнасці, інтэрнэт-прастора — ледзь не адзінае месца, дзе можна сустрэць сваё каханне (асабліва калі вы даўно выйшлі з падлеткавага і студэнцкага ўзросту).

Вы ўсё яшчэ ў пошуку? Паспрабуйце зарэгістравацца на сайце знаёмстваў, а лепш — адразу на некалькіх. Вы атрымаеце неабмежаваныя магчымасці для зносін з прадстаўнікамі супрацьлеглага полу з многіх краін свету. Але калі ваша мэта — доўгачасовыя адносіны, варта падысці да пытання сур'ёзна.

САМА САБЕ ПІЯРШЧЫЦА

Складанне анкеты падобнае да работы піяршчыка. Мы павінны прадставіць сябе найлепшым чынам — невербальна і вербальна — і стварыць пра сябе самае поўнае ўяўленне. Пачнём з візуалізацыі, гэта значыць з фота. Перш за ўсё — будзьце сумленныя. Адмоўцеся ад фоташопа і рэтушы. Ваш патэнцыйны выбранніх павінен выбраць менавіта вас, а не вашу падпраўленую версію. Будзе выдатна, калі пры сустрэчы мужчына падумае (ці скажа): «У жыцці ты лепшая, чым на фота!», а не наадварот.

Абмяжуйцеся некалькімі фатаграфіямі. Дзясяткі фота стомяць гледача, а магчыма, нават будуць раздражняць. Хопіць чатырох якасных фота, сцвярджаюць псіхолагі. І гэта не павінна быць напаўаголеная натура. Нават калі ў вас формы і фігура не горшыя, чым у Ірыны Шэйк, скажыце цвёрдае «не» фота ў бікіні, у ніжняй бялізне, у сексуальных сукенках з глыбокім дэкальтэ і г. д. Хоць, вядома, усё залежыць ад мэты складання анкеты. Калі вы зацікаўлены ў каротката рміновым бурным рамане — забудзьцеся на нашы парады і выкладвайце любыя фота. Але калі шукаеце сур'ёзныя адносіны і, магчыма, спадзяецеся на марш Мендэльсона як іх лагічны працяг, першым фота павінен быць партрэт. На партрэце лепш усміхацца. Усмешка пасылае гледачу невербальны сігнал пра вашу адкрытасць, пазітыўнасць і паспяховасць. Другое фота выбіраем у поўны рост — прыгожае, але без залішняй пачуццёвасці. Мужчыны любяць вачыма, і, прымаючы рашэнне аб сустрэчы, ім важна ацаніць постаць той, якую яны запросяць (ці не запросяць) на спатканне.

Два астатнія фота павінны расказаць пра вашы інтарэсы і захапленні. Калі вы любіце пячы тарты і пірожныя, будзьце на фота за работай, любіце жывёл — сфатаграфуйцеся з любімым сабачкам або катком на руках, калі малюеце — на фоне сваіх карцін. Памятайце: вы шукаеце блізкага па духу чалавека, таму неабходна стварыць дакладнае ўяўленне пра сябе.

Цяпер выбіраем нікнэйм. Можна, вядома, не замарочвацца і напісаць свае сапраўдныя імя і прозвішча (або псеўданім) — але гэта нічога пра вас не раскажа. А можна з дапамогай нікнэйма трохі раскрыць сваё стаўленне да жыцця.

Пішам пра сябе. Тут патрэбна «залатая сярэдзіна», бо можна ўпасці як у адну, так і ў іншую крайнасць. Многія практычна нічога пра сябе не пішуць — і гэта няправільнае рашэнне. Бо чалавек, якому спадабалася ваша фота і якога зацікавіў ваш нік, абавязкова пяройдзе на спасылку, каб даведацца пра вас больш, — а яго чакае расчараванне. Але ёсць і іншая крайнасць — графаманія. На яе звычайна пакутуюць дзяўчаты з гуманітарнай адукацыяй. Пішыце пра сябе выразна, коратка, шчыра і душэўна, без клішэ і шаблонаў — гэта не рэзюмэ для прыёму на работу. Дакладна пазначце свае пажаданні да патэнцыйнага выбранніка: калі вы шукаеце чалавека для сур'ёзных і доўгіх адносін, напішыце пра гэта. Гэта, напэўна, значна скароціць колькасць наведвальнікаў вашага прафайла, затое будзе менш тых, каго вы адсееце. Будзьце сумленныя, апісваючы свае інтарэсы, — не трэба баяцца выглядаць несучаснай, занудная, адсталай ад жыцця. Усе людзі розныя: магчыма, якраз вашае «несучаснае» захапленне пакажа таму самаму мужчыну, што менавіта вас ён шукаў усё жыццё.

І, вядома, ваш аповед пра сябе не павінен утрымліваць граматычных, пунктуацыйных, смешных стылістычных памылак — гэтым вы адразу адсечаце адукаваную частку мужчынскай аўдыторыі. Дадайце ў свой «рэкламны тэкст» гумар, па жаданні можаце «прыправіць» аповед глыбокай, разумнай і небанальнай цытатай — адным словам, давядзецца папрацаваць. А каб работа не была марнай, у першую чаргу падумайце пра сябе, паспрабуйце лепш зразумець тую непаўторную асобу, пра якую вам трэба расказаць свету.

СЕМ ВАЖНЫХ ПАРАД

— Усвядомленасць і абачлівасць — галоўныя саюзнікі жанчыны, якая вырашыла зарэгістравацца на сайце знаёмстваў, калі яна нацэлена на паўнавартасныя адносіны, — адзначае **практычны псіхолаг Кацярына АЛЁХІНА.** — Перш за ўсё, пазбягайце любога негатыву — і ў анкеце, і пры наступных зносінах у чаце. Нашы дзяўчаты любяць скардзіцца на жыццё, а часам бываюць залішне агрэсіўныя. Але ў сетцы, як і афлайн, падчас знаёмства вельмі важнае першае ўражанне. Разумная, спакойная і шчаслівая жанчына выглядае годна і прывабна. Тая, што ные і пакрыўджана на ўвесь свет, — не надта. Пры гэтым важна ўмець карэктна, але цвёрда адмаўляцца ад знаёмстваў, якія апрыёры не маюць перспектыў. Не ўцягвайцеся ў непатрэбныя дэбаты і не марнуйце час на тыя кандыдатуры, якія вам не падыходзяць.

А цяпер — правілы падыходу да пошуку «свайго чалавека» на сайтах знаёмстваў.

Тэлефонная размова замест тысячы радкоў у чаце. Нібыта ваш новы знаёмы здаецца вам цікавай асобай. Дамоўцеся з ім пра тэлефонную размову. Паслухайце яго голас, ацаніце манеру гаварыць. Віртуальныя зносіны моцна скажаюць наша ўяўленне пра суразмоўцу, тым больш што на сайтах знаёмстваў шмат людзей, не гатовых ні да чаго большага, чым перапіска ў чаце. Толькі не тэлефануйце са свайго нумара — завядзіце для такіх званкоў дадатковую SIM-карту.

Не спяшайцеся адказваць згодай на прапанову аб сустрэчы. Цалкам верагодна, што ваш віртуальны суразмоўца проста не ведае, чым заняць свой вечар, і вырашыў ад няма чаго рабіць сустрэцца з вамі. Калі ён сапраўды зацікаўлены ў сустрэчы, яго не спыніць чаканне. Прызначце сустрэчу праз некалькі дзён — і пачакайце яго рэакцыі. Яна шмат пра што вам раскажа.

Праграма сустрэчы не павінна быць занадта насычанай. Калі з яго падачы ўвесь вечар вы здзяйсняеце круіз па барах, клубах і боўлінгах, не паспяваючы толкам перакінуцца двума словамі — як вам зразумець, які ўнутраны свет гэтага чалавека і ці падыходзіць ён вам? Такі націск — улюбёны прыём пікапераў, а таксама жанатых мужчын, якія вырашылі ненадоўга «вярнуцца ў маладосць». Першыя сустрэчы варта правесці ў спакойнай абстаноўцы. За павольнай гутаркай вы зможаце лепш зразумець і ацаніць чалавека. Бо ў доўгіх адносінах важная не толькі сексуальная сумяшчальнасць, але і агульнасць інтарэсаў і поглядаў на жыццё.

Першая сустрэча — не занадта доўгая. Аптымальны варыянт — падчас абедзеннага перапынку ў будны дзень. У гэтым выпадку, каб яе карэктна перапыніць (калі кандыдат вам не падыходзіць), дастаткова будзе заклапочана зірнуць на гадзіннік і сказаць: «Мне пара вяртацца на работу».

Выразна пазначце межы дапушчальнага. Так вы зможаце адсеяць маніпулятараў. Калі вы атрымліваеце прапанову даслаць фота ў купальніку, заехаць дадому да віртуальнага знаёмага або паехаць з ім за горад — ці трэба казаць, што гэта не ваш варыянт?

Не спрабуйце здавацца кімсьці іншым. Не варта прымяншаць на парутройку гадоў свой узрост, прыдумляць сабе модныя хобі, неіснуючыя інтарэсы і больш яркую гісторыю жыцця, замоўчваць сваіх дзяцей ад першага шлюбу. Вы хочаце знайсці таго, хто пакахае менавіта вас, а не «версію вас з папраўкай на моду і запыт».

Не адчайвайцеся. Часам зносіны на сайце знаёмстваў могуць балюча ўдарыць па самалюбстве. Але не трэба апускаць рукі. Нават калі некалькі сустрэч скончыліся няўдала, гэта яшчэ нічога не значыць. Верце ў сваё шчасце — і пачынайце быць шчаслівай ужо зараз.

Дзіяна РОНІНА.

Двое — гэта...

ДАВАЙ ПАЖЭНІМСЯ!

Ці варта захоўваць шлюб дзеля дзіцяці, чаму неабходна жыць асобна ад бацькоў і як зрабіць адносіны моцнымі — на гэтыя і іншыя пытанні адказала Яніна КОНАЎКА, псіхолаг сталічнага Цэнтра паспяховых адносін.

— Што падахвочвае маладых людзей уступаць у шлюб?

— Прычыны могуць быць розныя. Сярод іншых — запал, пры якім з'яўляецца жаданне знаходзіцца побач з чалавекам як мага часцей. Таксама гэта можа быць імкненне выйсці з-пад кантролю бацькоў і пачаць дарослае, самастойнае жыццё. Яшчэ адзін матыў уступлення ў шлюб — цяжарнасць...

— Што рабіць, калі перад уступленнем у шлюб адчуваеце няўпэўненасць у правільнасці выбару?

— Лепш за ўсё адразу ўсталяваць выразныя межы таго, калі і пры якіх сітуацыях вашы адносіны працягвацца не могуць. Пад выхадам «за рысу» могуць разумецца з'яўленне алкагольнай, наркатычнай залежнасці, фізічная агрэсія, здрада. Гэта варта абмяркоўваць напачатку, закранаючы ўсе дэталі кожнага аспекту. Бо бываюць сітуацыі, калі праз некаторы час у шлюбе становіцца зразумела, што чалавек не гатовы да сур'ёзных сямейных адносін.

— Чым абумоўлены вялікі працэнт распаду шлюбаў паміж маладымі людзьмі?

— Недаўгавечнасць многіх ранніх шлюбаў мае навуковае тлумачэнне: лобныя долі мозга, якія адказваюць за наш свядомы выбар, завяршаюць сваё фізіялагічнае паспяванне да 25 гадоў. Іншымі словамі, свядома вызначыцца з партнёрам для далейшага жыцця можна толькі пачынаючы з гэтага ўзросту. Да 25 гадоў прынятыя рашэнні абумоўліваюцца гармонамі, парывамі пачуццяў.

— Ці варта жыць сумесна з бацькамі, калі адсутнічае ўласнае жыллё?

— Калі ёсць магчымасць зняць кватэру і пажыць некаторы час удваіх, то лепш так і зрабіць. Сямейнай пары неабходны час, каб прывыкнуць адно да аднаго, выпрацаваць свой рэжым дня, нормы і правілы. Жывучы разам з бацькамі, дастаткова цяжка ўсё гэта ажыццявіць, бо даводзіцца прыстасоўвацца яшчэ і да старэйшага пакалення. Але калі іншыя варыянты пражывання немагчымыя, важна адразу выразна абазначыць як бытавыя, так і фінансавыя межы.

— Якім чынам зносіны паміж бацькамі ўплываюць на паводзіны іх дзяцей у шлюбе?

— Жывучы з бацькам і маці, мы штодня бачым, як яны вырашаюць канфліктныя сітуацыі, як размяркоўваюць ролі і абавязкі. І гэтыя ўяўленні нясем з сабой у дарослае жыццё. Адносіны бацькоў могуць па-розному ўплываць на тое, як пабудуюць шлюбы іх дзеці. У адных выпадках маладыя людзі, абапіраючыся на ўзорнае жыццё старэйшага пакалення, імкнуцца стварыць нешта падобнае. У іншых — дэструктыўныя адносіны бацькі і маці могуць увогуле сфарміраваць у іх дзяцей страх уступаць у шлюб.

— Ці з'яўляецца нараджэнне дзіцяці вырашэннем праблем, якія накапіліся ў сям'і?

— Такое меркаванне можа прывесці да яшчэ большых цяжкасцяў, бо дзіця не толькі не ліквідуе канфліктныя моманты, але і павялічвае іх колькасць. Гэта абумоўлена тым, што да ролі мужа і жонкі далучаюцца ролі бацькі і маці, якія неабходна рэгуляваць. Калі ва ўзаемаадносінах мужа і жонкі з'яўляюцца праблемы, варта своечасова звярнуцца па дапамогу да псіхолага — тады можна вырашыць хвалюючыя пытанні больш хутка, якасна і без сур'ёзных наступстваў.

— Ці варта захоўваць шлюб дзеля дзяцей?

— Думкі пра тое, што бацькі жывуць разам дзеля яго, выклікаюць у дзіцяці лішнюю адказнасць і навязаную віну. Гаварыць з ім на тэму разводу варта тады, калі прынята канчатковае рашэнне. Часта дзеці вінавацяць сябе ў тым, што бацькі больш не разам, ад чаго вельмі перажываюць. Таму расставацца пры наяўнасці дзіцяці неабходна вельмі цывілізавана, без лішніх эмоцый. Важна таксама агучыць дзіцяці прычыны разводу. Гэта звязана з тым, што дзеці, не атрымаўшы неабходнай інфармацыі ад бацькоў, пачынаюць самастойна аналізаваць усё, што адбывалася, спрабуюць вызначыць, што паслужыла падставай для расстання. Варта растлумачыць, чаму бацька з маці будуць жыць асобна. Таксама трэба захаваць у дзіцяці добрае меркаванне пра кожнага з бацькоў, нават калі ў рэальнасці іх учынкі не заўсёды былі годныя. Важна паднесці аб'ектыўную інфармацыю, закрануць як станоўчыя, так і адмоўныя моманты. Дзіця не павінна забываць, што абодва бацькі добрыя і працягваюць яго любіць.

— Чым пагражае абмеркаванне сямейных праблем з сябрамі і сваякамі?

— Калі ўзнікаюць канфліктныя сітуацыі, то найлепшым рашэннем будзе звярнуцца да псіхолага. Наша асяроддзе складаюць бацькі, сябры, калегі, і, звяртаючыся да іх па падтрымку, вы будзеце чуць суб'ектыўныя парады, хутчэй за ўсё, заснаваныя на іх асабістым вопыце. Спецыяліст жа, з'яўляючыся незалежнай і бесстаронняй асобай, узважана падыдзе да сітуацыі і дасць прафесійныя рэкамендацыі.

Псіхолаг расказала, якія правілы варта выконваць, каб адносіны былі моцныя і прыносілі толькі станоўчыя эмоцыі:

— Па-першае, варта мець дакладнае і аб'ектыўнае ўяўленне пра тое, якім павінен быць ваш партнёр. Важна разумець, што ўсе найлепшыя якасці і рысы наўрад ці будуць сабраныя ў адным чалавеку. Таксама неабходна вызначыцца, што для вас прыярытэтнае ў сумесным жыцці: стабільны заробак партнёра, але разам з тым шчыльны працоўны графік, ці вялікая колькасць вольнага часу, які ён можа праводзіць з вамі.

Па-другое, трэба не забываць, што з узростам знешнасць мяняецца.

Па-трэцяе, памятаць пра тое, што шлюб — гэта заўсёды кампраміс. Калі вы ўмееце дасягаць згоды без лішніх эмоцый, спакойна абмеркаваўшы хвалюючыя пытанні, то мноства канфліктаў можна вырашыць незалежна ад узросту.

Акрамя таго, павінны прысутнічаць тры ўзроўні супадзенняў. Першы — фізіялагічны, калі партнёрам камфортна знаходзіцца побач адно з адным. Да гэтага адносіцца і фізічная блізкасць. Другі ўзровень — інтэлектуальны. Ён азначае наяўнасць агульных інтарэсаў, падобных поглядаў на баўленне вольнага часу. Трэці — каштоўнасна-духоўны ўзровень. Тут маюцца на ўвазе падобныя ўяўленні і меркаванні пра жыцце, сям'ю, дзяцей, грошы і гэтак далей. Гэтыя ўзроўні супадзення абумовяць паўнавартаснае развіццё пары ў далейшым.

А ўвогуле, шчаслівыя адносіны — гэта заўсёды праца двух людзей, і толькі сумеснымі намаганнямі можна прайсці цяжкія этапы і ўмацаваць свае пачуцці.

Асабістае

Анёл з блакітнымі вачамі

Ніна расла ў шматдзетнай сям'і, у атмасферы бязмежнай любові. І ёй здавалася, што ўсе людзі так жывуць. Таму неяк не ўпісвалася ў створаную ёй прыгожую карцінку жыцця нязграбная сваячка Любка — глухаватая, згорбленая і непрыгожая дзяўчынка, такога ж прыкладна ўзросту, як і Ніна. Тая не любіла, калі Любка са сваёй малодшай сястрой прыходзілі да іх, старалася меней размаўляць, каб яна доўга не затрымлівалася, а адзін раз сказала адкрыта: «Ты, Таня, заставайся, а ты, Люба, ідзі дадому. Зараз да мяне прыйдуць сяброўкі, ты нам будзеш замінаць». Любка пакорліва ўцягнула галаву ў плечы і выйшла ў калідор, але малодшая Таня з крыўдай у вачах зірнула на Ніну і адказала: «Я таксама пайду».

Танін позірк даў зразумець Ніне, што яна зрабіла нешта нядобрае. Але тут сяброўкі падышлі, і яна забылася на гэты выпадак, прабачэння не папрасіла і нават не заўважыла, што дзяўчынкі тыя зусім перасталі да яе прыходзіць... Потым Ніна стала школьніцай, часу на гульні з сябрамі амаль не засталося. А неўзабаве яна даведалася, што ў стрыечных сясцёр Любы з Таняй памерла маці, і бацька пераязджае з імі ў іншую, далёкую вёску. Ніна тады падумала з палёгкай, што не трэба будзе саромецца сваёй «ненармальнай» сваячкі. І надоўга забылася пра Любку. А ўспомніла... праз 40 гадоў.

...Хавалі дзядзьку Мішу, бацьку Любкі і Тані. Прыехала на пахаванне і Ніна. Любку пазнала адразу, яна быццам не змянілася, толькі слых стаў яшчэ горшы. Любка вінавата ўсміхалася, што не чуе пытанняў, углядалася блакітнымі вачамі бяскрыўдна і бясхітрасна, як у дзяцінстве. Тут і Таня з'явілася на парозе, паздароўкалася ветліва і папярэдзіла, што Любцы трэба казаць грамчэй. Таню Ніна не пазнала — высокая, мажная жанчына, дагледжаная і прыгожа апранутая ў чорнае. І муж у яе які відны, адзначыла сама сабе Ніна. Ёй было прыемна, што гэты статны мужчына клапатліва адносіцца да Тані і Любы. І Любка слухала Таню, разумела па вачах і спяшалася выканаць усе яе даручэнні.

Таня ўмомант арганізавала ўсё неабходнае для пахавання бацькі, зладзіла вячэру, на якую прыйшла большасць вяскоўцаў. Вячэра была багатая, бабулі шапталіся з павагай у голасе, што «гэта ж усё Таня!» Ніну тое здзіўляла — яна ж такая малеча была, а бач, як усё ў яе выходзіць лёгка, быццам гэта Таня старэйшая за яе...

Толькі тады да Ніны нарэшце дайшло, як нясоладка жылося дзяўчынкам без маці. Людзі на вячэры шапталіся, што небарацы пашанцавала, узяў яе добры хлопец, вылюднела з ім, ён забяспечвае сям'ю ўсім на свеце.

І пра гісторыю Любчынай інваліднасці Ніна даведалася толькі цяпер. Люба з нараджэння развівалася нармальна, але ў два гады цяжка захварэла на запаленне лёгкіх, якое дало ўскладненне на слых. Урачы казалі, што аперацыя — гэта рызыка 50 на 50, і бацькі чамусьці не згадзіліся рабіць яе — відаць, пабаяліся, што дзяўчынка зусім аглухне. Блакітнавокая Любка ў шэсць гадоў чытала, лічыла і з нецярплівасцю чакала, калі пойдзе ў школу. Але маці параілі аддаць дзяўчынку ў школу-інтэрнат для дзяцей з праблемамі слыху і зроку, маўляў, там будзе лепш. Яна так і зрабіла. Але Любка, якая ў сваім жыцці нідзе ніколі не была, так спужалася чужых, што адмовілася есці і днямі сядзела каля акна і выглядала маму. Цэлы тыдзень не ела, пакуль яе не забралі дадому. Стрэс, мабыць, паўплываў на дзіцячую псіхіку, Любка пачала стараніцца людзей, хавалася за матчыну спадніцу і ў школу больш не пайшла. Усе навыкі па чытанні і пісанні быццам сцёрліся ў галаве. Ёй прызначылі інваліднасць. Малодшая Таня зноў навучыла яе лічыць, чытаць і пісаць і была за маму, калі той не стала, але школу Любка так і не скончыла.

Ніне крыўдна было, што чужыя людзі лепш ведаюць пра жыццё яе стрыечных сясцёр, чым яна. І горка плакала Ніна, ад'язджаючы з вёскі, — у вачах доўга стаяла сіратлівая постаць Любкі, якая вінавата ўсміхалася і махала на развітанне ўсім, хто ад'язджаў.

...Праз некалькі гадоў да Ніны дайшлі чуткі, што Таня забрала сястру да сябе ў горад. Любка захварэла — анкалогія... Пахавалі яе каля бацькі. Таня казала, што тыднямі сядзела каля сястры ў бальніцы, трымала за руку, абяцала, што «хутка паедзем у вёску». Любка верыла і цярпела. «Толькі ў апошнюю ноч раптам гучна прамовіла: «Мама, я хачу да цябе!» Вясковыя жанчыны выціралі слёзы і казалі, што Любка — залаты чалавек. «Як мы будзем без цябе, — плачучы, прыгаворвала старэнькая суседка. —Ты ж паполеш свае кветкі і мае прыйдзеш папалоць, і Маніны, і ўсіх па вуліцы. Ты ж нам усім малака і хлеба прывозіла на веласіпедзе з магазіна. Усё, што ні папросім, і здачу да капеечкі аддавала. Нікому не адмовіла, усім нам старалася. Як мы без цябе?»

І Ніна плакала — так шкада было блакітнавокую Любку... А дома яе раптам разанула па сэрцы — убачыўся як на далоні той дзень з дзяцінства, калі прагнала з хаты «непрыгожую» сястру. І так балюча стала — быццам анёла прагнала. Анёла з блакітнымі вачамі...

Валянціна БОБРЫК.

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»
10 сентября 2020 года в 15.00
проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена продажи бел. руб., без НДС	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
1	Прицеп БелДТ-3031, 2010 года выпуска, инвентарный номер 1949	9100,00	Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156	910,00

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **10 сентября 2020 года в 15.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **07.09.2020 г.**, время: 17.00.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

Гомельский филиал Республиканского унитарного предприятия «Институт недвижимости и оценки» (организатор торгов) информирует о проведении повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 5 % после первых несостоявшихся торгов по продаже имущества, находящегося в государственной собственности – легкового автомобиля RENAULT KOLEOS, принадлежащего Республиканскому унитарному сервисному предприятию «Агентство развития и содействия инвестициям» на праве хозяйственного ведения
Дата проведения аукциона: 09 сентября 2020 г. в 10.00
Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1

Предмет торгов (лот № 1): Легковой автомобиль RENAULT KOLEOS, регистрационный знак 0205 ЕЕ-3, год выпуска 2012. Страна-изготовитель: Корея. Тип: легковой универсал. Цвет: белый металлик. Номер кузова (рамы): VF1VY0C0VUC420021. Объем двигателя: 2500 см^3. Вид топлива: бензин. Коробка передач автоматическая. Пробег: ок. 200 000 км

Начальная цена: 20 135,30 рубля (без НДС*). **Задаток: 1 006,76 рубля** (без НДС*).
* Согласно п.п. 2.3 п. 2 ст. 115 Особенной части НК РБ

Местонахождение имущества: Гомельская область, г. Гомель, ул. Федюнинского, 17

Местонахождение организатора торгов, контакты: г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95, e-mail: inogomel@tut.by, auction-gino@gino.by

Извещение о проведении аукциона опубликовано 25.08.2020 г. на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора торгов gino.by

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

Информация о застройщике:
Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации

В течение трех предшествующих лет ООО «СИ-трейдинг» как заказчиком строительства были построены следующие объекты, расположенные в д. Копище Минского района: жилой дом № 19/4 по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 10 месяцев; жилой дом №1 по ул. Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 22 месяца; жилой дом № 21Б по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 17 месяцев; жилой дом № 5 по улице Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 15 месяцев.

Информация об объекте строительства

Цели строительства – строительство многоквартирного жилого дома в составе объекта «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло» в г. Минске.

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:

начало строительства – апрель 2019 года;

окончание строительства – октябрь 2021 года.

Результаты государственной экспертизы проектной документации:

Положительные заключения государственной экспертизы № 1021-60/18 от 08.11.2018, № 1388-60/18 от 21.01.2019, № 1021-60/18-Д1 от 20.02.2020 г., выданные Дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по г. Минску».

Сведения о месте нахождения объекта строительства:

Местонахождение объекта строительства: Республика Беларусь, город Минск, Центральный район, ул. Гастелло. К объекту строительства примыкают: с севера – существующая среднеэтажная жилая застройка, с юга – ул. Гастелло и существующий сквер, с запада – существующая среднеэтажная жилая застройка и участок посольства Турции, с востока – существующая среднеэтажная жилая застройка и ул. Тарханова.

Характеристика объекта строительства:

Проектной документацией предусматривается строительство жилого дома по ул. Гастелло (далее – «жилой дом») по индивидуальному проекту.

Жилой дом 9-10-этажный с двумя подземными уровнями, цокольным этажом, «теплым» техническим чердаком и встроенными помещениями общественного назначения имеет следующие основные показатели: количество секций – 4; количество квартир – 186 (в том числе однокомнатных – 112, двухкомнатных – 16, трехкомнатных – 49, четырехкомнатных – 9); гостиница на 12 номеров с подсобными и вспомогательными помещениями с отдельными входами; 5 административно-торговых помещений с отдельными входами; гараж-стоянка на 199 машино-мест.

Жилой дом расположен в центральном районе г. Минска. Транспортное обслуживание осуществляется с улиц Гастелло и Тарханова. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Конструктивная схема жилого дома – монолитный железобетонный каркас с заполнением мелкоштучными кладочными материалами наружных стен. Здание имеет в каждой из секций по одному лифту.

В жилом доме предусмотрены поквартирные системы отопления с устройством индивидуальных узлов учета тепла. В качестве нагревательных приборов приняты радиаторы и конвекторы. Вентиляция жилых помещений – естественная с притоком через окна (микропроветривание). Вентиляция гаража-стоянки, администрации гостиницы с фитнес-залами – приточно-вытяжная с механическим побуждением; номеров гостиницы, административно-торговых помещений – механические вытяжные системы с естественным притоком через окна (микропроветривание). Здание оборудовано системой хозяйственно-питьевого водоснабжения, для гаража-стоянки предусмотрена система противопожарного водоснабжения. В здании предусмотрена система дымоудаления из гаража-стоянки, система подпора воздуха в шахты лифтов и тамбур-шлюзы в гараж-стоянке, автоматическое пожаротушение в гараж-стоянке. В жилых комнатах предусмотрена установка автономных пожарных извещателей.

Электроснабжение осуществляется путем поквартирной установки электрощитов. Учет потребляемой электроэнергии осуществляется электросчетчиками, установленными для каждой квартиры. Предусмотрена автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ).

Для телефонизации жилого дома предусмотрено построение пассивной оптической системы (PON), обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов, высокоскоростного интернета, цифрового телевидения. Для обеспечения содержания входной двери в подъезд закрытой на замок, двухсторонней связи с жильцами и дистанционной разблокировки из квартир входной двери используются видеодомофоны.

Строительная готовность жилых помещений:

- частичная внутренняя отделка: штукатурка стен и перегородок, стяжка пола, монолитные железобетонные потолки;
- вентиляция – естественная по схеме: приток через окна (микропроветривание), вытяжка через каналы унифицированных вентблоков;
- электроснабжение – поквартирная разводка электроосвещения с установкой выключателей, звонка, электросчетчика, без установки электроплиты, розеток (за исключением 1 розетки под модем). Без внутриквартирной разводки электроснабжения;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, полотенцесушитель, выводы для подключения санитарно-технических приборов;
- канализация – стояк, выводы для подключения санитарно-технических приборов, установка унитаза;
- отопление водяное – скрытая в полу разводка, отопительные приборы (радиаторы, конвекторы);
- окна и двери на балконы – из ПВХ-профилей со стеклопакетом;
- телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в квартиру, оптическая розетка;
- видеодомофон;
- дверь входная – металлическая;
- автономный пожарный извещатель.

